
Яраслаў
Пархута
ТАМ, ДЗЕ
ЖЫВЕ
ЮЛЬКА

Яраслаў
Пархута

ТАМ, ДЗЕ ЖЫВЕ ЮЛЬКА



ЛІРЫЧНЫЯ НАВЕЛЫ

МІНСК
«МАСТАЦКАЯ ЛІТАРАТУРА»
1978

Бел 2
П 18

П $\frac{70803-061}{М\ 302(05)-78}$ 154—78

© Выдавецтва «Мастацкая літаратура», 1978 г.

У ДАРОЗЕ

На далёкую палескую станцыю мяне прывёз цягнік.

Стаяла ціхая месячная ноч, і я мо з гадзіну прабыў у невялічкім прывакзальным скверыку.

Па шасейцы, што пралягала побач з чыгункай, час ад часу праязджалі машыны, і я вырашыў не чакаць рэйсавага аўтобуса, дабірацца ў Астравок спадарожным транспартам.

Але туды, колькі ні апытваў шафёраў, машыны не ішлі. Можна было пад'ехаць толькі да Залесся, а там і пехатою недалёка. Я рызыкнуў і на світанні быў ужо ў Залессі. Стаяў пасярод вуліцы і чакаў хоць якую жывую душу, каб лепей распытаць дарогу. Нарэшце з бліжняй хаты выйшла маладзіца.

— Падкажыце, як трапіць у Астравок?

— А чаму не падказаць? Падкажу!— усміхнулася кабета, паказваючы белыя, як драбкі часнаку, зубы.— Ідзі вунь таею сцежачкай, каля старога рэчышча, потым возьмеш крыху лявей, пройдзеш сотню-другую метраў і па правай руцэ ўбачыш адразу тры сцежкі. Ступай толькі сярэдняй і, калі перасячэ яна яшчэ адну сцежку, збоч з яе, прайдзі крыху, а затым нібы вярніся назад і там ужо, дзе балацінкай, дзе сухапутам, шыбуй

напрасткі ажно ў самы Астравок.— Яна зноў даверліва ўсміхнулася і дадала: — Зразумееў?

— Зразумееў,— кажу.— А другой дарогі няма?

— Чаму няма? Ёсць! — зноў выставіла зубкі маладзіца і паказала вачыма сабе пад ногі: — Гэная хоць і даўжэйшая, ды павіхляе крыху, але выведзе якраз на Жукава поле. А там — рукой падаць — і Астравок...

Вядома, выбраў другі шлях. Але, як неўзабаве пераканаўся, і ён быў не з лёгкіх. Пералескамі ішлося яшчэ сяк-так. Быў надзейны арыенцір. Пад нагамі — дзе спружыніла, а дзе і пыліла — ляжала ўсё ж якая ні ёсць, а дарога. Потым у лясной гушчэчы і яна знікла — неяк раптоўна распалася на безліч сцежак. Паспрабуй здагадайся, якой трэба трымацца. Сюды б тую маладзіцу! Няхай бы сказала, каторай з іх належыць «ступаць»...

Выбраў нарэшце самую ўбітую сцежку і рушыў далей.

Яшчэ хвілін дзесяць хады, і раптам сцяжынка ўзбегла на бязлесны пагорак. Я спыніўся, зачараваны.

Там, унізе, спакойна ляжала возера, а на яго не дужа крутым беразе стаяла вёска. З пагорка здавалася, што гэта зусім і не вёска, а казачны карабель, які аднойчы прычаліў да берага ды так і застаўся там...

Я глядзеў, як над вёскай нараджаецца дзень, і адчуванне было такое, нібы сам нараджаўся на-

нова. Здавалася, вось-вось адбудзецца цуд: абноўлены, поўны нейкага ўнутранага цяпла, раптам вазьму і зраблю свой самы першы крок па зямлі...

Недзе ў прыбярэжным чароце прачнуліся птушкі.

На азёрную роўнядзь упала пара чыркоў. Аднекуль даляцеў бусліны клёкат. А над Астраўком у ранішнім сінім бяздонні купаліся і купаліся ластаўкі.

І неяк дабрэла, спакайнела на сэрцы...

АСТРАВОК

Астравок — вёска не з вялікіх. Усяго некалькі дзесяткаў хат — старых і зусім новых.

Старыя хаты чамусьці не трымаюцца адна адной, а разбегліся — якая куды — і пазіраюць на прахожага задумлівымі вокнамі. Тая задумлівасць, пэўна, ад таго, што маюць хаты немалады век, на працягу якога паставалася свая, адзіная на ўвесь белы свет, надзея, а цяпер сплыла тая надзея ў далёкае і беззваротнае мінулае. І мо таму вокны тых хат успыхваюць па вечарах агеньчыкам усё радзей і радзей, а пад некалі смалістаю бэлькай парыпвае толькі ў выхадныя дні лазовая, яшчэ дзедава, калыска...

Новыя хаты, наадварот,— выстраіліся ў рад, як напаказ. І глядзяць на свет не задумлівымі, а цікаўнымі вокнамі. Адхіліцца раптам фіранка, і акно будзе доўга цікавацца за вуліцай: а хто ж гэта прыехаў да нас? Мо назусім вярнуўся?..

РУСАЛКА

Атабарыўся я не ў цэнтры сяла, нават не ў дамку-церамку для заезных людзей, а ў канцавой хаце мясцовага каваля. Не на бойкім месцы стаяла тая хата, сяліба збягала ледзь не да самай вады, і я быў рады, што займеў такое зручнае жытло. З гаспадаром бачыўся не часта, таму неяк само сабою сталася, што здружыўся з яго дачкою — пяцікласніцай Юлькай. Яна для мяне зрабілася і гідам, і добрай дарадчыцай.

Мы кожнай нядзельнай раніцай выцягвалі з падстрэшша вуды, ішлі на ўлюбёныя Юльчыны мясціны і заміралі ў чаканні акунёў.

Але ў той дзень на возеры чаплялася, як Юлька казала, толькі адна матрасня. Капітана падчапіць не ўдавалася. І дзяўчынка, абхапіўшы рукамі калені, з надзеяй у вачах усё глядзела і глядзела на паплаўкі.

Раптам Юлька падхапілася.

— Не ўловім! — сказала яна.— Хадзем на раку. Мо русалку пабачым...

І павяла мяне Юлька ад возера, напрасткі, ледзь прыкметнай сцяжынаю — спачатку балацінкай, а потым і сухапутам, зарослым непрывабным драбняцом. Нарэшце перасеклі гасцінец і апынуліся на даволі-такі ладнай лугавіне, пасярод

якой і ляжала тая віхлястая палоска ракі. Прайшлі яшчэ крыху берагам, і Юлька прыклала палец да вуснаў:

— Тутака...

Мы леглі над самым вірком і пачалі ўзірацца ў яго таямнічую глыбіню. Тады-сяды з-за аблокаў паказвалася сонца, прасвечвала вірок, і відаць было, як там, над пясчаным дном, ляніва снавалі цені. Іншы раз яны рабілі разварот, і дно нібы ўспыхвала і адлівала срэбрам. Язёў змянялі акуні, і тады Юлька, зачараваная ўбачаным, шаптала:

— Во дзе яны!.. І ўсе — капітаны...

А русалкі не было і не было. Ці яна не пажадала нам трапляць на вочы, ці адплыла кудынебудзь у суседні вірок, Юлька не ведала і таму лічыла сябе нібы вінаватай. Я адчуваў гэта, бачыў, як хмурыўся тварык дзяўчынкі, і хораша задумаў пра яе. Бач, адважылася прыадкрыць завесу свайго таямнічага свету, а цяпер вось і перажывае...

Доўга яшчэ ляжала Юлька ў траве. Прылятаў аднекуль свежы ветрык, і берагавы аксаміт пераліваўся жывымі хвалямі. Мне здавалася ў такія хвіліны: побач са мною з распушчанымі льнянымі косамі не Юлька — русалка.

ГАРАЧЫМ ПОЎДНЕМ

Маці стаіць на парозе і гукае:

— Юлька! Дзе ты падзелася, Юлька?!

Юлька ляжыць на самым вільчыку страхі, чуе, што кліча яе маці, але не падае голасу — дужа не хочацца пакідаць аблюбаванага месца. А маці зноў гукае, толькі цяпер больш патрабавальна:

— Юль-ка-а!.. Я ж табе!..

Юлька саслізгвае з хлеўчука ў лебяду, выбягае на падворак, на хаду атрасаючы з плацейка саламяныя асцюкі, і падыходзіць да маці.

— Зноў на сваёй верхатуры была? — ужо незлабліва пытаецца маці ў Юлькі і дадае: — Аднясі бацьку полудзень...

Юлька нехаця бярэ з матчыных рук важкую авоську і выходзіць за веснічкі.

Пясок на вуліцы, як прысак, і Юлька скіроўвае на сцежку, што віецца ля платоў пругкай, адшліфаванай стужкай. На сцежцы няма такой гарачыні, і нагам робіцца добра. Але побач з платамі Юлька адчувае сябе маленькай-маленькай, і ёй становіцца крыўдна. На хлеўчуку вальней і лепш. Адтуль, зверху, і бачна далей, і ўсё здаецца цікавейшым. Там Юлька — нібы гаспадыня ўсяго гэтага...

Варта ёй захацець, і можа хоць гадзіну глядзець, што робіцца на Арсенавым падворку, як заходзяць туды чужыя дзядзькі і Арсен выдае ім вёслы... Юлька ў такія хвіліны чамусьці спачувае Арсену. Дзядзькі паедуць катацца ці рыбаліць на тых лодках, а яму — сядзі ды смажся на сонцы. Бо нельга адлучацца. Яму трэба заўсёды быць пад рукою...

Куды цікавей глядзець на вуліцу. Са страхі добра відаць ажно да калгаснай канторы. І крама добра відаць. Юлька, лежачы на вільчыку, любіць адгадваць, па якія пакупкі ідуць у краму людзі, і робіць гэта амаль беспамылкова. Але што датычыць прыезджых, дык яна часцей за ўсё памыляецца. Спыніцца якая машына, выйдзе з яе некалькі дзядзькоў або цётак, і паспрабуй адгадай, што надумалі яны ўзяць у той краме. Да таго ж выходзяць адтуль не з авоськамі, а з пакункамі.

Ці згледзіш, што загорнута ў паперу?

Каб не дакараць сябе за такое няўмельства, Юлька перастае цікавацца за пакупнікамі, адварочваецца і глядзіць на Нупрэева дворышча. Бліжні край таго дворышча засланяюць прысады, затое астатняя частка — як на далоні. І буслянка — як на далоні. Здаецца, працягні руку і дакранешся да бусліхі. Яна сядзіць на гняздзе, уторкнуўшы пад крыло чырвоную дзюбу, і дрэмле. Прачынаецца толькі тады, калі прылятае бусел і становіцца на ўскрайку гнязда...

Але глядзець на тую санлівую бусліху таксама надакучвае. І тады Юлька пераварочваецца на спіну: у небе навыперадкі бягуць белыя аблокі...

А сёння Юлька не паспела наглядзецца ні на вуліцу, ні на буслоў, ні на неба. Не паспела налюбавацца тымі белымі аблокамі-баранчыкамі. Але яна яшчэ нагледзіцца...

Вось ужо і кузня відаць.

Юлька на хаду папраўляе авоську і прыбаўляе кроку.

ВЕЧАРАМ

Юлька ляжыць на ложку, за грубкаю, і дзівуецца: чаму так атрымліваецца? Варта захацець толькі, і яна можа ўзнавіць убачанае за дзень ці ўсё па парадку, ці кавалкамі. Для гэтага трэба адно — добранька заплюшчыць вочы і затаіцца. І пабягуць тады перад вачыма дрэвы, людзі, машыны... А чаму так атрымліваецца — Юлька не ведае. Хацела яшчэ вясною запытацца ў настаўніцы, але пасаромелася. А калі даверылася маці, тая толькі паціснула плячыма. Дзіўна! Ёй нават ніколі нічагусенькі не сніцца! А Юльцы і сніцца, і бачыцца...

Юлька лічыць, што трэба паболей трэніравацца. Тады яна зможа нават не рабіць урокаў. Няхай настаўніца выклікае да дошкі — не збаіцца. Прыплюшчыць крышачку вочы — і стане пераказваць тое, што чула на папярэднім уроку, калі настаўніца тлумачыла новую тэму... Во дзіва будзе!..

Яна ляжыць, затоеная, і думае: з чаго б гэта сёння пачаць? Бо не хоча, каб бачылася абы-што. Якая цікавасць, напрыклад, зноў спрачацца з Зоськаю? Падумаеш, гербарый яна сабрала! За лета Юлька не такі сабярэ! З самых прыгожых кветак!.. Альбо ўзяць хаця б тое Арсенава ляся-



ня! Ну і няхай сабе выходзіць ласіха са сваёй малечай на ўскрай лесу! Юлька іх не раз бачыла. Нічога цікавага. Тое ласяня, як бычок іхні... Толькі дужа цыбатае. І гарбаносенькае...

Юлька нацягвае да падбародка суконную коўдру, і нечакана бачыцца ёй кузня. «Дзінь-дзінь! Дзінь-дзінь!» — ляціць з кузні вясёлая песня. Гэта бацька ўдарае молатам па жалезіне. Юлька ведае: чым большая жалезіна ляжыць на кавадле, тым басавіцейшы, гусцейшы звон адлятае ад яе. А калі бацька трымае ў абцугах якую драбязу — кавадла заўсёды пяе молада і зухавата... Ды варта ў дзвярах кузні паказацца Юльцы, песня тая сціхае — бацька апускае молат і ўсміхаецца:

— Будзем палуднаваць?

— Будзем! — адказвае Юлька, і яны пакідаюць кузню.

Але перш чым сесці пад куст бэзу, бацька падыходзіць да жалезнай бочкі, што ажно ўрасла ў зямлю крыху воддаль дзвярэй, і мые рукі. Толькі потым кіруе ў цянёк. Юлька тым часам рассцілае на мураве ручнічок, дастае з авоські хлеб, свежыя гуркі, кавалак духмянага кумпяка і корч зялёнай цыбулі. Ядуць спачатку моўчкі, нібы спяшаючыся. А калі саб'юць ахвоту, бацька першы хваліць наедак.

— Смаката! — гаворыць ён.— Люблю вось так...

Ёй рупіць запытацца, чаму бацька сёння пра-

цуе не ў прасторнай майстэрні, дзе шмат розных станкоў і машын, а тут, у гэтай старэнькай кузні, але раздумвае. Якая розніца, дзе працаваць!..

Юлька паварочваецца да сцяны і нейкі час ляжыць сцішаная. З прачыненых дзвярэй у пакой далятае матчына гамонка. Яна, тая гамонка, нібы закалыхвае Юльку, і Юлька зноў заплюшчвае вочы і затойваецца...

Нечакана далятае да Юлькі ледзь чутны, нібы стомлены, рокат матора. Яна азіраецца і бачыць: напрасткі праз выган бяжыць да іх «козлік». Ля кузні спыняецца, і з яго выходзіць Осіпавіч — старшыня калгаса. Бацька падымаецца, хоча пайсці насустрач, але Осіпавіч ужо заўважае іх, крочыць да куста і на хаду пытаецца:

— Загараем?

— Абедаем! — адказвае бацька і зноў сядае на сваё месца.— Мо і ты з намі, Осіпавіч?

— Вады шклянку выпіў бы,— адказвае старшыня.— Упрэў, гойсаючы па брыгадах...

Бацька падае біклагу і нібы спачувае:

— Таксама турбот хапае?..

— Хапае! — адказвае Осіпавіч і пазірае на Юльку: — Памочніца?

Бацька таксама пазірае на Юльку і задаволена ўсміхаецца. А Юльцы чамусьці ўспамінаецца той дзень, калі яна ўпершыню ўбачыла Осіпавіча. Тады бацька сказаў: малады, не пацягне. А праз год зусім іншае сказаў пра старшыню: цягавіты! Юлька ўсміхаецца, прыгадаўшы тое

дзіўнае слова «цягавіты», і хітравата паглядае на Осіпавіча. Бацька пытаецца:

— Як цяперака ў нас?

— А ведаеш, нyблага!— адказвае старшыня.— Тарфянікі выручаюць! І дрэнаж, брат, апраўдвае сябе...

Юльцы робіцца нецікава слухаць тую гаворку пра нейкі дрэнаж, яна падымаецца і бяжыць на выган — збіраць рамонкі. Яна заўсёды збірае тут рамонкі, прыносіць іх дадому, стаўляе ў глячок і кожны раз заўважае, як у такія хвіліны даб-рэюць матчыны вочы.

— Кветкі — што дзеці! — абавязкова кажа маці.— З імі весялей.

Чаму весялей з дзецьмі — Юлька не разумее. Іншы раз маці так накрычыць на яе, так накры-чыць!.. Нібы на чужую ці непатрэбную... А тут — на табе! — весялей...

Неўзабаве Юлька вяртаецца, прымошчваецца ў цяньку на траве і пачынае перабіраць каліўцы кветак. І ўжо слухае і слухае тую гамонку Осі-павіча з бацькам... Потым чамусьці зноў чуецца матчын голас. А праз хвіліну і ён аддаляецца, кудысьці сплывае. Толькі рамонкі на стале не перастаюць духмяніць мядовым пахам. І Юлька праз сон усміхаецца тым рамонкам...

ЛАСІХА

Ужо каторы дзень яе даймалі дварнякі. Спачатку гэта здавалася нібы забавай. Ну, забеглі ў яе лясныя ўладанні, ну, скубанулі колькі разоў — і адчэпяцца. Але дзе там! Па дурной сваёй сабачай звычцы яны з кожнай хвілінай усё больш і больш насядалі на яе. Тады яна кінулася ў гушчар, спраставала балотца, абабегла бор — ды ўсё тое ж: дварнякі не адступалі.

А што, калі падацца бліжэй да вёскі?

Але і пасля гэтага сабакі, ці то адчуўшы блізкае жытло, ці магчымую дапамогу, накінуліся на яе яшчэ з большым азартам.

Хацелася піць. І стома, здавалася, вось-вось зваліць з ног. Але яна зноў і зноў кідалася па лесе то туды, то сюды.

Юлька выходзіла з хаты, услухоўвалася ў той брэх і пацiскала плячыма:

«З чаго б гэта?..»

Толькі Арсен — мясцовы егер — здагадаўся, што да чаго. Ён паслухаў залівісты брэх, што прыносіла ў вёску лясное рэха, і сказаў:

— Браканьеры. Асядлалі некага...

Узяў на ўсялякі выпадак стрэльбу і падаўся ў лес. Калі апынуўся на палянцы, застыў, уражаны. Маладая ласіха стаяла на той палянцы, уклен-

чыўшы, відаць, ушчэнт знясіленая, а ля яе завіхалася ажно трое дварнякоў. Людзей не было. Дварнякі свавольнічалі адны. Прыгледзеўся. Не! Такіх у вёсцы няма. Значыць, прышлыя!

— Ах, нягоднікі! — крыкнуў Арсен.— Што ж гэта вы робіце?!.

Толькі разбойнікі і вухам не павялі, а яшчэ больш пачалі даймаць сваю ахвяру. Тады Арсен не вытрымаў, ускінуў стрэльбу, выбраў крайняга і без шкадавання стрэліў... Калі ўляглося рэха і сабак нібы ветрам здзьмула, ласіха паднялася з зямлі і, цяжка ступаючы, пайшла. Не ў лес, а на яго, Арсена. Арсен скочыў за дрэва. Усялякае можа быць, калі звер раз'ятраны. Але ласіха і не думала рабіць нічога благога чалавеку. Яна спакойна падышла да сасны, за якой стаяў Арсен, і спынілася побач.

Егер глядзеў на ласіху і не верыў сваім вачам. Потым сказаў:

— Чаго ты, дурніца? Ідзі, куды табе трэба...

Доўга стаялі побач — чалавек і звер,— і ніхто не адважваўся зрабіць першы крок. Потым Арсен рызыкнуў. Адышоўся крыху, азірнуўся і ўбачыў: за ім тупала ласіха.

Так і давяла яна чалавека да Астраўка.

...Нядаўна Юлька ўбачыла на ўзлеску ля вёскі тую ласіху. Ласіха спакойна паглядала на яе і мірна карміла танканогае ласяня.

ТАЯМНІЧЫЯ ЛЮСТЭРКІ

Юлька любіць прыбягаць у гэтыя мясціны. Тут столькі таямнічых люстэркаў!

Яны то там, то тут прыхаваны па лесе — нібы хто знарок параскідаў іх на радасць усім лясным жыхарам.

Люстэркі — самых разнастайных памераў і форм.

І кругленькія, нібы шкельцы ад акуляраў, і авальныя, і прамавугольныя...

Юлька прадзіраецца густым падлескам і праз якую сотню метраў раптам спыняецца. На ўскрайку невялікай палянкі яе ажно асляпляе промнямі люстэрка. Зменіць кірунак — і праз хвілін дзесяць зноў тое самае... Вада ў люстэрку — спакойная, чыстая, настоеная на непаўторным лясным водары. Кожны лісток, кожная галінка, што апынуліся там, добра праглядаюцца з яго няплыткага дна.

Юльцы ў такія хвіліны думаецца: чыё ж гэта будзе тварэнне? Чалавека? Прыроды? Чалавеку было б зусім недарэчна рабіць тут, побач з возерам, тыя копанкі-азярынкі. А навошта прыродзе ўтвараць іх сярод сухога сасновага бору ці дубровы?

Зразумець яшчэ можна б, калі б тыя люстэркі

мелі пакатыя берагі. Яны ж — наадварот — стромкія...

Таямніца, сапраўдная загадка!..

Стаіць Юлька і спрабуе адшукаць усяму гэтаму адказ. Дарэмна. Уяўляецца толькі чамусьці, як ціхім летнім світанкам выходзяць з тых азярынак русалкі, садзяцца пад соснамі і расчэсваюць свае русявыя косы...

Але гэта толькі на імгненне. Больш яскрава бачыцца: ціхаю месячнаю ноччу прыбягае сюды дзікая козачка, доўга стаіць, услухоўваючыся ў лясныя шолахі, і толькі тады прыпадае да духмянай ляснай вады...

ЛЕСАВІЧКІ

Аднойчы Юлька падбіла мяне пашукаць зубровую траву.

Абышлі дубнякі, бярэзнікі, аблазілі, здавалася, усе больш-менш прыдатныя палянкі, але тае зуброўкі — ні-ні.

Даймала духата. Ужо хацелі падавацца назад, як на прасецы, што ўзбягала на пясчаны пагорак, заўважылі дзяцей — хлопчыка і дзяўчынку. Басаногія і да чарнаты загарэлыя, яны сядзелі ў гарачым пяску і з нечым важдаліся. Падбівала цікаўнасць і мяне, і Юльку зблізку зірнуць на іхні занятак. Каб, крый бог, не напалохаць сваім нечаканым з'яўленнем, Юлька наўмысна кашлянула, і мы выйшлі з-за куста. Дзеці не спалохаліся.

Хлопчык усміхнуўся і сказаў:

— На, патрымай!

І падаў Юльцы... сарачаня. Нічога не разумеючы, Юлька ўзяла ўжо даволі апераную птушку і паціснула плячыма: навошта яна ёй?

Дзяўчынка падхапілася з пяску і пачала тлумачыць:

— Мы з ім у чарніцы ішлі... І ўбачылі: уліпла вунь там... Ножкамі... Так моцна! І крыльцамі махала...

Юлька зірнула туды, куды паказвала дзяўчынка, і ўсё зразумела. Нехта згубіў на лясной прасецы камлыгу чорнай смалы. Пад промнямі сонца яна пачала плавіцца, і ад яе пабегла ручаінка. Маладыя, не вопытныя яшчэ птушкі, відаць, палічылі, што гэта вада, і паплаціліся. Праўда, паплацілася адна, тая, што ляжала ў смале, а другой — пашчасціла.

Юлька адчувала толькі, як перапалохана калацілася сэрца ў птушкі...

Юлька з удзячнасцю зірнула на дзяўчынку, на хлопчыка і зусім па-даросламу ласкава запыталася:

— А чые ж вы, лесавічкі, будзеце?

— Мы — тутэйшыя! — пачулася ў адказ.

ПЕЦЯ-ПЕВЕНЬ

Звычайна, калі сам сабе загадаеш падняцца на досвітку — падымешся абавязкова. Асабліва, як яшчэ звечара звязаны ў пучок і прыстаўлены да ганка, каб быць пад рукою, вуды, а недзе пад каменем, у бляшанцы, нецярпліва варушацца чырвоненькія, бы на падбор, чарвячкі. Ды на гэты раз здраджваеш даўняй завядзёнцы. Пасля тлумнага і клопатнага дня надта спіцца. Выручае Пеця.

— Уста-вай-це-е! — чуецца раптам яго патрабавальны голас, і ты прачынаешся.

Пеця стаіць на падаконніку расчыненага насцеж акна і ў здзіўленні пазірае на цябе. Вінавата ўсміхаешся яму і паціху — каб не пачулі гаспадары — кажаш:

— Кыш!

Ды дзе там! Ніякай увагі! Два ўдары крылом, і зноў тое ж:

— Уста-вай-це!..

Якая ветлівасць! І каб не быць у даўгу, таксама ветліва гаворыш:

— Ды ўстаў я, Пеця, устаў...

Нарэшце Пеця саскаквае ў гародчык і, горды ад выкананага абавязку, ідзе наводзіць парадак на сметніку.

Ухапіўшы з сенцаў вясло, выбягаеш на ганак. Першыя промні сонца зырка б'юць у вочы. На небе — ні воблачка. На вішнёвым лістку ўспыхвае расінка і скатваецца на дол. Золатам гарыць і раса на траве. А ступі босаю нагою — ажно апячэ прыемнай прахалодай.

Пераходзіш вуліцу, мінаеш чыесьці гароды і, крыху прайшоўшы поплавам, спыняешся на прыстані. Лодка — на месцы. Пакуль будзеш гнаць яе па рукаве, што, нібы нажом, разразае прыбярэжныя чараты, сонца ўвачавідкі падымецца і, не такое ўжо чырвонае, спакойна павісне над берагам.

Цішыня. Возера быццам спіць. Але гэта толькі спярша здаецца. Варта пакласці вясло і прыслухацца, як пачуеш: недзе крэкча крыжанка, пялёскаюцца ў «вокнах» вадзяныя куркі. Захочацца пабачыць іх зблізку — тут жа прыстанеш да якога-небудзь зялёнага астраўка і хоць гадзіну будзеш сядзець, не варухнуўшыся, у надзеі на незвычайную сустрэчу.

Куркі — выслізнуць з чаратоў нечакана. І не дзве-тры, а ўсім сваім шматлікім сямействам. Некалькі хвілін яны будуць прыглядацца, сюды-туды пакручваць свае смешныя — з белымі бляшкамі — галоўкі, а потым распачнуць такое адчайнае пялёсканне, што здасца: у тым «акне» вясковая дзятва купаецца... Ад асалоды птушкі лупцуюць па вадзе крыламі і ажно стогнуць. Але раптам над чаратамі праплывае цень каршука.

Гучыць каманда бацькоў, і куркі знікаюць пад вадою...

Застаецца пакінуць засаду і весляваць да самых уловістых мясцін. А як іх адшукаць? Учора, скажам, добра чапляўся карась, а сёння, хоць сто разоў мяняй месца, карася таго нават не ўбачыш. Учора вярнуўся з неблагім уловам акунёў, а сёння акуні нібы і не начавалі тут... Але настойліва цярэбішся ад адной купіны серпавіцы-травы да другой і, дастаючы вяслом ілістае дно, шукаеш глыбейшага месца.

Зноў-такі, дзе яе, тую глыбіню, знойдзеш? Затока зарастае, заільваецца і мяняецца на вачах нават аднаго пакалення. «Во каб якую помпу прыдумаць! — успамінаеш Юльчыны разважанні.— А потым з затокі высмактаць тую бузу ды на палі вывезці... Возера абмаладзілася б, і ўраджай падскочыў бы...» І раптам захочацца пераканацца: ці многа тае «бузы» на азёрным дне. Але дубовае — у тры метры — весла ідзе ў дол, як у масла. Каля метра вады, а там — ліха ведае, які слой ілу...

Выбраўшы больш-менш здатную мясціну, нарэшце закідваеш вуды. Але — дзіва! Не паспелі паплаўкі супакоіцца, як раптам адзін за адным зніклі пад вадой. Гэта ў атаку пайшла акунёвая матрасня. Па чарзе падсякаеш паласацікаў і ўжо карыстаешся адной вудаю. Мінут дзесяць работы — і ўсё замірае. Праз паўгадзіны клёў паўтараецца — нібы па камандзе знікаюць па-

плаўкі. Такая цыклічнасць хутка надакучае, і хочацца падражніцца з чырванапёркамі. А яны — не акуні, патрабуюць тонкай работы, імгненнай рэакцыі і дакладнасці. І вуду трэба закідваць далей — ажно пад суседнюю купіну серпавіцы, а вудзільна — трымаць пастаянна ў руцэ...

Нарэшце ты збіў аскоміну і, здзіўлены прыемнай нечаканасцю, вырашаеш зняцца з якара і браць курс на прыстань.

Першы сустрэне цябе на падворку, вядома, Пеця-певень. Ён абавязкова будзе стаяць на верхняй прыступцы ганка і, як толькі ступіш за веснічкі, ударыць крыло аб крыло і загадае:

— Сустра-кай-це-е!

Сустрэне цябе Юлька, прыме вязанку з уловам і, радасная, пабяжыць у хату.

ЧАЛАВЕК ВАДЫ

У вокнах хаты ажно плавіцца сонца. Яно час ад часу хаваецца ў верхавінах недалёкіх сосен, і тады шыбіны змахваюць з сябе тое полымя, становяцца блакітнымі, пад колер неба і возера.

Нейкім бакавым зрокам заўважаю ледзь прыкметную ўсмешку на Арсенавым твары і, здаецца, разумею чалавека: ён зрадніўся з гэтымі вось соснамі, што зялёнымі шапкамі кранаюць высознае неба, з гэтым вось дубам, што спакойна застыўля веснічак і каторы ўжо год нясе тут сумленна сваю службу, з возерам, што коціць унізе свае хвалі.

— А сапраўды, не змог бы без усяго гэтага,— пагаджаецца егер.— Іншы раз спытаю ў сябе: а што б ты, Арсен, рабіў, каб раптам узяло ды і высахла тваё возера? І тут жа адказваю: перабраўся б на другое. А калі б тое высахла? На трэцяе падаўся б!..

Ён на хвіліну змаўкае, думаючы аб нечым сваім, і нечакана пляскае па маім калене шырокай, як вясло, далоняй:

— А ведаеш? Ляшча ў азярові з кожным годам усё болей. А чаму яго болей — і не здагадаешся! — зноў пляскае далоняй-вяслом і дадае: — Таму, што рознай драбязы паменела. Во чаму!..

Твар яго маладзее, і цяпер не скажаш, што за плячыма ў чалавека нямала пражытых гадоў. Нечакана аднекуль налятае вецер, варушыць лісцем антонаўкі і пырхае на бліжнюю лапіну дуба. Адтуль дапінае на самую макаўку і там, у кучаравай чупрыне, пачынае ўжо зухавата шамацець. Арсен пазірае на макаўку дуба, круціць туды-сюды носам і пытаецца:

— А чым жа гэта запахла?

Я таксама кручу носам і адказваю:

— Жывіцаю нібыта...

— І жытам,— удакладняе ён.— З Жукава поля... Гэтак заўсёды бывае перад дажджом...

Нейкі час Арсен сядзіць нерухома, а потым падымаецца і кажа:

— Аднак бегчы трэба! — Ідзе ў хляўчук, выносіць дубовыя вёслы і на хаду ўжо раіць: — А на Жукава поле абавязкова падскоч! Гэта святое месца...

На парог выходзіць Арсенава жонка, моўчкі пазірае ўслед мужу і нібы сама сабе, але галасна гаворыць:

— І што за чалавек удаўся! Ледзь ногі валачэ, а ўсё на ваду прэцца. Нібы не можа без тае вады абысціся...

АБНАЎЛЕННЕ

Юлька глядзіць, як з-за лесу ў бок вёскі паўзе агромністая, перапоўненая рашучасці хмара, і чакае нечага незвычайнага. І тое, незвычайнае, неўзабаве прыходзіць.

Спачатку заскакалі па зямлі кроплі-гарошыны, цвічкамі ўбіліся ў пясок і ўзнялі воблачкі пары. А потым успыхнула першая бліскавіца і пачуўся першы, нясмелы яшчэ, удар грому.

Разоў некалькі паўтарылася такое, а затым то там, то тут пачалі перакрэсліваць неба маланкі ды раз-пораз скаланалі наваколле грымоты. І ўжо ні тых ластавак над самай зямлёй, ні тых вераб'ёў на платах — усё недзе пахавалася. Толькі вясковыя хлапчукі, асядлаўшы дубцы, лёталі і лёталі па прыціхлай вуліцы і падбадзёрвалі:

Дожджык, дожджык, секані —
Мы паедзем на кані...

Не паспелі яны выказаць сваё жаданне, як неба прарвалася і лінула адтуль, быццам з начовак.

Хмара неўзабаве сплыла, растварылася ўдалечыні, за лесам, а яе нечаканаму прыходу яшчэ доўга радавалася ўсё жывое. Нават трыпутнік — спрадвечны ахоўнік сцяжын — і той набрыняў парнай вільгаццю і паслухмяна лёг пад Юльчыны босыя ногі...

МЫ ІДЗЁМ НА СІЦЫЛІЮ

— А ведаеш,— сказала назаўтра Юлька,— давай падамося на Сіцылію. Дзед Нупрэй казаў, што карасі там, як лапці...

Каб трапіць з Астраўка на Сіцылію, трэба спачатку прайсці гасцінцам, павярнуць налева і пакручастымі сцежкамі нейкі час віхляць па масівах асушаных тарфянікаў. І калі пачнеш у душы каяцца, што выбраўся ў такі няблізкі шлях, раптам, нібы з-пад зямлі, вынырнуць некалькі прысадзістых дубоў, а потым і дзве хаткі пад імі. Гэта і ёсць Сіцылія.

Людзі назвалі мясціну Сіцыліяй таму, што яна — невялікае ўзвышша — ляжала, нібы той востраў, сярод бязмежнага мора колішніх непраходных балот. Тут і цяпер існуюць даўнія законы астравіцян: адлучаюцца з Сіцыліі толькі па вялікай пільнасці, не робяць шкоды наваколлю і заўсёды ўважлівыя да чужога чалавека. Мо таму, калі ў бліжняй хаце адчыніліся дзверы і на парог выйшла ў белай блузцы і такой жа белай спадніцы бабка, прызыўна замахала рукою, мы з Юлькай прынялі гэта як належнае.

Падзякавалі за прыветнасць і ўзяліся строіць свае вуды. А гаспадыня Сіцыліі прысела побач:

— Ого, Сіцылія! Дак тут і некалі было рыбы

плойма! — І раптам спахапілася: — Дак вы мо зегаладаліся? Мо яйцо якое на патэльню кінуць?

Мы аднекваліся, спасылаючыся на свае прыпасы, але бабка была няўмольная. І толькі калі выпілі па гліняным кубку халоднага малака, яна супакоілася і пачала раіць, дзе нам лацвей будзе «адводзіць душу».

— Дак вунь,— тлумачыла бабка,— за тую паваротку шыбуйце!

Мы спусціліся з дзядзінца, ступілі на мяккую, акуратна выстрыжаную касілкамі, зялёную коўдру лугавіны і пайшлі да паваротні. Калісьці там была рака, але меліяратары зрабілі сваю справу — выпрасталі старое рэчышча, а непралазную багну абапал яе ператварылі ва ўрадлівую сенажаць. Шаломы-стагі, якія то там, то тут узвышаліся над зялёным морам шаўкавістай атавы, віталі іх працу...

Карасі не чапляліся. Але мы сядзелі, не варушыліся, баючыся спудзіць сваю надзею. Калі сонца пачало хіліцца долу, да нас нечакана прыбегла гаспадыня Сіцыліі і пачала апраўдвацца:

— Дак я ж вінавата перад вамі!.. Месяц павярнуўся на малодзіва — карась чапляцца не будзе! Карась — рыба з норавам... Дак я ж не сказала вам пра ета...

Але якраз у гэтую хвіліну Юльчын паплавок уздрыгануўся і рашуча пайшоў пад ваду. Падсечка, прыемны звон нацягнутай лёскі — і да Юльчыных ног чмякнулася нешта чорнае.

— Дак, можа, гэных рагачоў толькі і наловіце! — раптам ажывілася бабка і пачала пасабляць Юльцы вызваляць вуду ад няпрошанай рыбіны.

Прызнацца, я такой рыбы нідзе не сустракаў. Чорная, з жабінай галавой і белаватым чэравам, узброеная трыма вострымі шыпамі, яна здавалася страшыдлам.

— Канадскі сомік! — сказала Юлька і выкінула таго рагатага чорта назад у ваду.

Нечакана стала шарэць. Паднялася і патупала на сваю Сіцылію бабка. Рэжучы густое паветра крылом, пачаў туды-сюды кідацца першы кажан. Недзе ў гаі прынялася лічыць нашых будучых карасёў зязюля. І Юлька нібы спахапілася:

— А давай заначуем! На золку нешта ды будзе...

Зматалі вуды і падняліся на Сіцылію. Каб не перашкаджаць людзям, пад крайнім дубам склалі невялікае цяпельца і дасталі свае прыпасы. Падышла гаспадыня, паставіла на зямлю спатнелы гарлач малака, сказала: «Дак частуйцеся!» — і прысела па той бок вогнішча. Было ад усяго гэтага неяк шчымліва добра. Ці то ад цеплыні, што сыходзіла ад нашага цяпельца, ці то ад начной парнасці — хацелася так вось, раптам, кінуцца на зямлю, легчы тварам дагары і, суцішыўшыся, праляжаць да самай раніцы...

— Як вы, бабулька, жывяце тут, сярод балота? — раптам пачуўся Юльчын голас.

— Дак мы ж тут нарадзіліся,— у спакойным роздуме адказала бабка.— Дак як жа пакінуць зямлю гэную...

Недзе ў бліжніх зарасніках ляшчыны азваўся першы салавей. Паспрабаваў свой голас, прыслухаўся, цёхкнуў яшчэ раз,— і так заліўся песняй, што здавалася, канца і краю не будзе таму дзіву. Пры святле цяпельца відно, як даверліва ўсміхаецца Юлька, як знікаюць на бабчыным твары зморшчынкі. А салаўі ўжо шчыльна абступілі нас. То там, то тут абуджаліся іхнія флейты і стараліся адна перад другой, як на спаборніцтве.

Бачу, бабка загінае пальцы правай рукі, потым шэптам гаворыць да Юлькі:

— А гэны, што справа, пераплюнуў гэнага... Ажно восем каленаў вывеў!..

Мяне цікавіць іншае, і, выбраўшы зручны момант, калі бабка перастала загінаць пальцы, запытаўся:

— Усё ж адкуль тут сомік-рагач узяўся?

— Дак з Канады прывезлі! — нечакана бадзёрым голасам адказала гаспадыня Сіцыліі.— З Канады, гавораць...

Салаўіная сімфонія абарвалася. Спевакі, мабыць, стаміліся ці вырашылі перавесці дух, каб праз якую хвіліну зноў грымнуць над сцішанай начной зямлёй.

А ШТО ЗА СІНІМІ ЛЯСАМІ?

Аднойчы, седзячы на кручы і пазіраючы на той бераг возера, Юлька нечакана запыталася:

— А што за сінімі лясамі? Я хачу пабачыць, што за тымі сінімі лясамі...

Нічога не заставалася, як пачаць перагаворы з Юльчынымі бацькамі наконт таго, каб адпусцілі дачку ў падарожжа.

Дазвол быў атрыманы. Кароткія, мітуслівыя зборы, і назаўтра на світанні наш човен пакінуў прычал. Праз гадзіну якую мінулі Выспу — зялёны востраў пасярод возера, а праз пэўны час адшукалі і выток ракі.

Цікава нараджаюцца рэкі! І гэтая таксама. Спачатку рака нібы намацвала сабе дарогу, быццам хацела пераканацца, ці не пашкадуе потым, адправіўшыся ў такі далёкі шлях... Але праз якую вярсту, прабіўшыся з лазняку, раптам адчула прастор. Свежы ветрык, прамені ласкавага сонца нібы ўдыхнулі ў яе незвычайную сілу, і яна, забыўшыся пра асцярогу, радасна кінулася наперад.

Іншы раз ёй даводзілася нялёгка. Крутыя пагоркі паўставалі на шляху — рабілі спробу пераняць дарогу, стрымаць яе імкненне. Ды рака, сабраўшы ўсю сваю сілу, смела кідалася на пера-

шкоду. І перамагала. Радая, пачынала шчыраваць. Яе шчодрасць адчувала ўсё навакольнае. Там, дзе прабягала яна, весела зелянелі палі, абапал берагоў буялі атавай лугі, а прырэчныя лясы ажно заходзіліся ад песень. Птушкі славілі яе напорыстасць і сілу, шчодрасць і шчырасць. І яна ад гэтага рабілася яшчэ болей упэўненая. Рака цяпер надзвычай весела гнала наперад сваю тугую плынь...

Юлька сядзела насупраць і, шчаслівая, усміхалася. Потым нечакана зірнула на мяне і прамовіла:

— А дзесяць тысяч гадоў таму назад якая была наша рака?

— Чаму дзесяць тысяч? — здзівіўся я такому незвычайнаму пытанню.

— Так,— задумліва адказала Юлька.— Хочацца ведаць...

Што было адказаць Юльцы? Як яе перанесці ў той далёкі дзень? Хіба паспрабаваць?..

— У той дзень, Юлька,— пачаў я,— над гэтым краем стаяла таксама ціхая раніца... На лясістых узвышках сярод непралазных балот спакойна пасвіліся табуны танканогіх аленяў і чуйных тарпанаў, ганарлівых тураў і самавітых зуброў. У сакавітай балотнай траве спакойна гаманілі шэрыя гусі. А ў ціхіх затоках плавалі прыгажуны лебедзі... Усе яны — і птушкі, і звяры — з цікаўнасцю пазіралі на незвычайных прышэльцаў. А тыя на плытах пракладвалі сабе



дарогу ў іх спрадвечныя ўладанні... Апранутыя ў шкуры звяроў, прышэльцы час ад часу прыбачальвалі да берага і дзівіліся з усяго гэтага багацця. Бо там, адкуль яны выбраліся ў такі далёкі і рызыкоўны шлях, усяго гэтага было надзвычай мала...

Потым яны выбралі, можа, нават вунь той лясісты ўзгорак. І чалавек упершыню ступіў на незнаёмую зямлю. За час вандроўкі прытупіліся каменныя нажы. Паламаліся наканечнікі стрэлаў. Павышчэрбваліся крамянёвыя сякеры. І тады твая зямля, Юлька, паспачувала. Яна сказала: ты — чалавек! І рукі твае за час падарожжа не забыліся разбіваць каменную камлыгу, выточваць з упартага крэменю патрэбныя прылады... Дык бяры крамянёвую камлыгу і рабі з яе, што захочаш!..

Абнадзееньі чалавек з удзячнасцю глядзеў на першыя дары гэтай зямлі. Як на сваё збавенне. І вочы яго святлелі. А калі на агрубелую далонь леглі амаль ювелірнай работы наканечнікі стрэл, вострыя нажы і сякера, ён упершыню за апошні час уздыхнуў з палёгкай.

Потым жанчыны майстравалі жытло. Збіралі ў густых зарасніках ляшчыны арэхі ды карміл і сваіх немаўлят. А мужчыны? Яны, напэўна, хадзілі вакол і высочвалі дзічыну. Яе сустрэць было няцяжка. Куды цяжэй было падпаўзці да птушкі ці звера на адлегласць надзейную. Каб не спужаць марна выпушчанай стралой... Толькі

калі выконваўся гэты даўні і непарушны закон, да звону нацягвалася цеціва і страла рабіла сваю імгненную справу...

Яшчэ і цяпер, Юлька, то каля возера, то на пясчаных градах-узгорках крыху ў баку ад гэтай ракі людзі знаходзяць паляўнічыя прылады нашых далёкіх продкаў. Крамянёвыя сякеры, наканечнікі стрэлаў, каменныя скрабкі, нажы... Цэлы скарб!

Зірнеш на той скарб, Юлька, і ўяўляеш: з якой радасцю сустрэла паселішча першыя трафеі гэтай зямлі! Пакуль здабывалі агонь і раскладалі вогнішча, паляўнічыя адпачывалі. А потым з прыску вымалася смажаніна, дзялілася пароўну і пачыналася святочная вячэра...

— Ой! — ускрыкнула Юлька.— Як цікава было! А мы зможам у прыску зрабіць смажаніну?

— Усё зможам... І смажаніну таксама... Гэта продкам нашым цяжка было. А нам — лягчэй лёгкага!..

...Па правую руку паказаліся першыя хаты першай вёсачкі за сінімі лясамі. І наш човен прычаліў да берага.

ПЕСНЯ СТАРЫХ ПЛЫТАГОНАЎ

Быў позні вечар. Цёплы, парны, які можа быць толькі ў сярэдзіне лета. Была яшчэ і поўня — румяная, вясёлая. Яна зачапілася за вільчык нечае хаты, знерухомела і ліла на зямлю сваё бляклае, нясмелае святло. Потым нечакана зрабіла спробу адарвацца ад таго вільчыка. І калі ёй гэта ўдалося — усё наўкол пасвятлела, ажыло, нібы напаказ выставіла сябе. Хоць пералічвай жоўты штыкетнік, які больш па традыцыі, чым з патрэбы, аблямоўваў сядзібы.

Але ні мне, ні Юльцы лічыць той штыкетнік не хацелася. Лежачы на падсохлым за дзень аеры, мы глядзелі на кволае цяпельца, што сыходзіла гаркаватым дымком. І тут пачуліся крокі, а праз хвіліну — і хрыплаваты голас:

— А хто гэта прычаліў да нас?

Я азірнуўся і ўбачыў: недалёчка застылі дзве постаці. Рады такой нечаканасці, весела адказаў:

— Гэта мы — астравецкія... Ляжым вось і чакаем світанку...

Дзяды, здавалася, і не слухалі. Той, што быў бліжэй, тым жа хрыплаватым голасам прамовіў:

— А мы вось ідзём з кумам і бачым: агонь цепліцца... Дай, думаем, завярнём...

І, нібы ён быў тут гаспадаром, падсеў да вог-

нішча і пачаў падкідаць у цяпельца сухія галінкі. Калі ярчэй успыхнуў агонь і жоўтыя языкі пачалі весела танцаваць па галінках, сказаў:

— Мо і закурыць, браток, маеш...

Спакойны, разважлівы голас, шчырае «браток», сказанае вельмі па-дамашняму, без падробкі і перавагі,— усё гэта было надта да душы. Праз якую хвіліну мы сядзелі ўжо, як даўнія знаёмыя, і вялі нетаропкую гамонку. Праўда, больш ахвочы да гаворкі быў Браток. Другі — хіба што час ад часу кідаў якое слоўца і толькі шамацеў сваім блішчастым кійком у зляжалым аеры.

— А ты не зважай на яго! — прыкурваючы ад вогнішча, спрабаваў растлумачыць такія паводзіны свайго напарніка Браток.— Кум спрадвеку маўчуном слыў. Бывала, гоніш плыты, наўкол толькі вада адна ды берагі... Тут бы і пагаварыць, душу адвесці, а ён сапе, і ўсё... Хоць за язык цягні... Аднак,— дзед зірнуў на свайго сябра і неяк зухавата, не па гадах, ляпнуў па плечуку: — Аднак у пары з табой, куме, увесь час і прахадзілі...

— Прахадзілі! — пагадзіўся кум.— А як жа іначай! І песень колькі прапялі!..

— Што праўда, то праўда! — падтрымаў кума напарнік.— Тут цябе ўгаворваць не трэба было... Бывала, так зацягнем, так зацягнем, што ажно берагі заслухаюцца!..

Ён змоўк, нібы ўспамінаючы нешта, нібы ўзважваючы: а ці не лепей памаўчаць? І раптам:

— А давай, куме, нашу! Колішнюю...

Кінуў недакурак у вогнішча, адкашляўся і тым жа хрыплаватым, але ўпэўненым голасам завёў:

Сустракаюць жанкі плытагонаў...

Кум, на здзіўленне маё, не замарудзіў і падхапіў:

Ой, плыта-го-наў!..

Потым у два галасы — суладна, бадзёра, молада:

Сустракаюць жанкі плыта-гонаў...
Ой, плыта-го-наў!..

І ўсё. Слоў — ніякіх. Адна толькі мелодыя. То бадзёра-зухаватая, то лагодна-тужлівая. Як бег крыніцы... Я не ўтрымаўся і запытаў:

— Ну, а словы, якія словы далей у гэтай песні?

Абарвалася мелодыя. Нечакана. Толькі чуўся ў суседняй затоцы стомлены плёскат хваль.

Раптам Браток падняўся.

— Ат! — нечакана ціха прамовіў ён.— Што словы! Былі і словы... Усё было...

І, не развітаўшыся, зрабіў крок ад вогнішча. За ім, абапіраючыся на свой бліщчасты кіёк, затупаў і яго кум.

Дзяды паволі ішлі ў вёску.

Мы з Юлькай глядзелі на іх асветленыя поўняй постаці, і да тае радасці за чалавечую спагаду, прастату і адкрытасць далучалася туга.

НЕЧАКАНАЯ СУСТРЭЧА

На світанку наступнага дня мы рушылі далей. Але не паспеў наш човен прайсці і некалькі паваротаў, як Юльку пачало хіліць на сон. Вядома, летняя ноч — з камарыную пяту. Ды і яе мы не скарысталі як трэба. Пакуль рыхтавалі вячэру, пакуль з тымі плытагонамі гаварылі — за поўнач пераваліла. А там — рукою было падаць і да світанку. Вось і клюе носам дзеўчына...

Нечакана для сябе прапанаваў:

— А мо павернем назад... Вунь колькі ўжо адмахалі!..

— Не-а! Не трэба! — схамянулася Юлька.— Я толькі прылягу на дні́шчы і падрамлю крышачку...

Яна паправіла ў чоўне асаку, падклала пад галаву рэчавы мяшок і сцішылася. Човен закалыхаў Юльку, і яна праз якую хвіліну ўжо спала. Я не стаў весляваць, а даверыў човен рачной плыні...

За плячыма ўжо даўно знік і той сіні лес, і тая невялічкая прырэчная вёсачка, дзе мы каратталі ноч, і цяпер перад намі ляжала раўніна, тамсям утыканая аблесенымі пагоркамі. Іншы раз у пойме ракі сустракаліся касцы. Распранутыя па пояс, яны здаля нагадвалі буслоў. А кветкі!

Столькі кветак, прызнацца, я не сустракаў ля Астраўка...

Але Юлька нічога гэтага не бачыла. І каб не расчароўваць яе потым, вырашыў дачакацца сушэйшага берага і толькі тады стаў прытарможваць вяслом. І тут Юлька ўсхапілася.

— Праспала? — Яна зажмурылася ад сонца.— Колькі я праспала?

— Ты, Юлька, не праспала! — адказаў я.— І ўвогуле за тваімі сінімі лясамі цікавага мала.

— Няпраўда! — запярэчыла яна і паднялася.— А вунь і хатка стаіць! Пасярод кветак... Ой, якая прыгожая хатка!..

Я азірнуўся і сапраўды ўбачыў крыху воддаль берага незвычайную хатку. Размаляваная каляровымі квадратамі, яна нагадвала шахматную дошку, пастаўленую патырчма.

— Прычалім? — запытаўся я.

— Прычалім! Прычалім! — ускрыкнула Юлька, саскочыла на пясок і пачала пасабляць выцягваць на бераг нашу пасудзіну.

Неўзабаве мы рабілі агледзіны. Гэта была не хатка, як спярша нам падалося, а шматпавярховы дом. У мініяцюры. З асобнымі кватэрамі. І з балконамі-ляткамі. З тых балконаў, відно было, адна за адной узляталі пчолы...

— Хітра прыдумаў! — сказаў я Юльцы пра гаспадара арыгінальнага вулея.— Вяліко фантазёр гэты пчаляр!

Не паспелі як след агледзець той шматкватэр-

ны пчаліны дом, як на лугавой дарозе паказаўся грузавік.

— Осіпавіч едзе! — радасна прамовіла Юлька і запляскала ў далоні.— Осіпавіч!

І праўда. Не даязджаючы якую паўсотню метраў, машына спынілася, і да нас пайшоў старшыня калгаса. Побач з ім — незнаёмы чалавек немаладога ўжо веку. Павіталіся. Осіпавіч спытаў:

— А як ты, Юлька, трапіла сюды?

Юлька па-даросламу адказала:

— Мы падарожнічаем...

— Вось яно што! — усміхнуўся старшыня.— Гэта добра, калі падарожнічаеш! А бацьку аднаго пакінула?

— Ён у кузні! — прамовіла Юлька і насупілася.— Напэўна, у кузні...

Незнаёмец хітравата падміргнуў Юльцы:

— Люблю падарожнікаў! І мядком частаваць іх люблю! — весела сказаў ён і звярнуўся ўжо да старшыні: — Вы, Осіпавіч, каб не пеканула каторая, ідзіце да ракі, а я тым часам пачастунак падарожнікам падрыхтую...

І, цяжка ступаючы па зямлі, накіраваўся да пчалінага дома, а мы ўтраіх — да ракі. Калі прыселі на беразе, я пацікавіўся:

— Хто гэта?

— Грыц? — пытаннем на пытанне адказаў старшыня.— Пчаляр з Малінаўкі! Дужа, скажу табе, цікавы чалавек... Яго ў нас пчаліным пастухом называюць...

ПЧАЛІНЫ ПАСТУХ

— Быў ён зусім яшчэ малады, калі грымнула вайна,— пачаў старшыня.— І пайшоў хлопец туды, куды ішлі ўсе нашы — ваяваць. Трапіў аднойчы ў такі бой, што сябры ледзь жывога выцягнулі. Пакрамсанага асколкамі. І, як рэшата, прадзіраўленага кулямі... Дактары так-сяк склеілі. Сшылі чалавека. І ў рэшце рэшт паставілі на ногі.

Але трымаць сякеру ці ручку плуга ён ужо не мог. Трэба было займацца нечым іншым. І рашыў ён прыдбаць сабе пчаліную сям'ю. Тая сям'я праз год-два дала пасынкі і дапамагла ўзбіцца на жытло. Пабудаваў чалавек сабе не харомы. Звычайную хаціну пабудаваў. Але акуратненькую і прыгожую.

У той хацінцы можна было ўжо спакойна каратаць сваю адзіноту.

Суседзі спачувалі яму. І, хаця тыя пасляваенныя гады не дужа шчыравалі хлебам, дзяліліся з ім і акрайцам, і бульбінай.

А ён аддзячваў ім толькі звычайным пчаліным мёдам...

Бывала, ляжыць на сваёй пасецы чалавек, пасе тых пчол, а сэрца ажно заходзіцца: не можа большым адплаціць за чалавечую дабрыню. Пры-

бяжыць вясковая дзятва, пасядзе кружочкам, а ён і пачынае расказваць то пра колішняе жыццё-быццё, то пра тую праклятую вайну... А потым вынесе гліняную міску, поўную залацістай вашчыны. Наце, скажа, ешце! Толькі вадою запівайце!.. Выпэцкаецца дзятва да вушэй, а яму — радасна...

Цяжэй стала, калі ў наступ пайшлі меліяратары і ля Малінаўкі асушылі лугі. Узятак быў ужо не той.

І невялічкая пасека не давала таго, што магла даць. Але чалавек не здаўся. Змайстраваў вось гэты дамок. У некалькі паверхаў. Перагарадзіў на пакойчыкі. Пафарбаваў кожны ганак-ляток у свой колер. Каб пчолы не блыталі... І перасяліў туды ўсе пчаліныя сем'і. І быў рады, што знайшоў выхад...

Кожную вясну, лета і восень, гледзячы, якая кветка і дзе меданосіць, збіраецца чалавек у вандроўку вакол вёскі. Рабіць гэта яму пасабляюць хлопцы-трактарысты. Падгоняць гусенічны трактар, падчэпяць тросам той стракаты дамок і валакуць, куды гаспадару трэба.

Пра новую дыслакацыю адразу ж пранюхвае вясковая дзятва. І хай сабе дзядзька Грыц атабарыцца ў малінніку, у ліпавым лесе, на дальніх грачаных палетках ці сярод верасовага мора, а хлапчукі тут як тут! Прыбеглі! І талакой дапамагаюць пасвіць тых пчол. То напоўняць вадою паілкі, то выскубуць траву ля ніжніх ляткоў...

А пад вечар, вядома, зноў з'яўляецца пасярод жывога круга тая ж гліняная міса...

Горш дзядзьку зімою. Але і тады людзі не забываюць пра чалавека. То пастукае ў дзверы сусед і прапануе самасаду. То заскочыць суседка і прынясе талерку салёных гуркоў. То забяжыць, ідучы са школы, тая ж дзятва... І доўгія для яго зімовыя дні робяцца не такімі доўгімі, а вечары — не такімі нуднымі...

Старшыня азірнуўся, убачыў, што Грыц ідзе да ракі, і змоўк.

Грыц нёс нам квадрат залацістай вашчыны.

ПАМЯЦЬ

Войны заўсёды пакідалі пасля сябе нядобрыя сляды. Яшчэ і цяпер на зямлі сустрэнеш руіны старажытных замкаў...

Тут таксама ёсць сляды далёкіх бітваў.

Аднойчы, гэта ўжо было пасля нашага падарожжа за сінія лясы, мы ішлі дадому сасновым борам, а на шляху раптам павырасталі курганкі. Адны большыя, нібы пагоркі, другія меншыя — у рост чалавека. Я пацікавіўся:

— Што гэта?

— Ат! — грэбліва адказала Юлька.— Прыхадні-французы ляжаць!..

Дык вось тут што! Вось дзе яны знайшлі апошняе сваё прыстанішча! Ляжаць, забытыя і людзьмі, і часам!.. І варта было ісці сюды!

— А там вунь магілка Макара-воіна! — у роздуме прамовіла Юлька.

Калі выбраліся на лясную дарогу, я заўважыў у некалькіх кроках ад яе невялічкую, але дагледжаную магілку. Хто быў гэты Макар-воін, якога роду-племені, Юлька не магла адказаць. Адно ведала: мужны чалавек быў той Макар-воін...

Юлька нарвала лясных званочкаў і паклала на магілу Макара-воіна.

ГЛУШЭЦ

Аднаго дня Юлька некуды знікла. Я ўжо і вуды сабраў, і насядзеўся на прызбе ў чаканні свае напарніцы, а яе ўсё не было і не было.

На раку давялося ісці аднаму. Знаёмая сцежка прывяла да таго вірка, дзе некалі з Юлькай пільнавалі русалку, і я, выбраўшы зручнае месца, прымасціўся на купіне. Паўдня правёў у адзіноце. Ужо было хацеў браць кірунак назад, у вёску, як заўважыў: напрасткі, размахваючы белай хусцінкаю, да ракі бегла Юлька. Спынілася ля мяне і адразу, не то дакараючы, не то апраўдваючыся, сказала:

— А ў мяне глушэц ёсць...

Глушэц? У гэтых мясцінах даўно зняліся глушцы! Тую птушку не ўбачыш нават вясною, на такавішчах. А тут — на табе! — глушэц, і ніякіх пярэчанняў... Я адчуваў, што Юлька вырашыла адкрыць перада мною яшчэ адну старонку свайго таямнічага свету, і запытаўся:

— А пакажаш?

— Хадзем! — узрадавалася Юлька, узмахнула хусцінкай і пабегла па лузе.

Яна лёгенька, як той матылёк, пералятала з купіны на купіну, прыпынялася, чакаючы мяне, і зноў ляцела да лесу... Перасеклі дарогу і ўвай-

шлі ў гушчар. Юлька адразу неяк сцішылася, ступала асцярожна, быццам баялася патрывожыць некранутую цішыню. А калі выбраліся на даволі шырокую прагаліну, дзе болей было і сонца, і паветра, спынілася:

— Глядзі!

Я зірнуў у той бок, куды паказвала Юлька, і ажно здзівіўся: на сасновым суку, метры за два ад зямлі, сапраўды сядзеў глушэц. У промнях сонца ён адліваў антрацытам і, здавалася, цікаўна пазіраў на нас. Юлька ўзяла мяне за руку, завяла на другі бок, спынілася і яшчэ раз сказала:

— Глядзі!..

І праўда! Ну, выкапаны — глушэц! І хоць ужо было зразумела, адкуль узялася тая птушка — крыху воддаль ад сасны чарнела старое вогнішча з карчамі-недагаркамі,— я не падаў выгляду, а толькі сказаў:

— Дык, можа, дамоў яго забярэш?

— Не, тут яму лепш! — раздумліва адказала Юлька.

ЛІПА ЦВІЦЕ...

Пасярод Астраўка стаіць высозная, на два абхваты ліпа...

Калі яе вецце пакрывалася залацістым цветам, то з усяго наваколля сюды зляталіся пчолы і гулі ў лістоце ажно да самага вечара. Вечарам пчол змяняла вясковая дзятва. І, пакуль не набіваліся ліпавым цветам іх зрэбныя торбачкі, дрэва гаманіла на ўсе галасы.

Любілі і дзядзькі святочнымі днямі збірацца пад ліпай. Пасядуць, бывала, у цяньку, пакурваюць самасад і перабіраюць вясковыя навіны.

Але грымнула вайна, і ліпу таксама не абмінула бяда. Счарнелая ад агню, яна каторы год стаяла пасярод апусцелай вуліцы і здавалася нежывой. І ні пчалінага гоману, ні дзіцячых галасоў не чуваць было ў яе парадзелай лістоце.

Зноў ліпа зацвіла недзе на трэці год пасля вайны. Але зацвіла неяк нерашуча, нібы раздумваючы: а ці варта выстаўляць сваю радасць напаказ?..

Цяпер штогод ліпа цвіце буйным, шчодрым цветам. Зноў з усяго наваколля злятаюцца сюды пчолы. Зноў пад вечар у ліпавым голлі гамоніць дзятва. А выхаднымі днямі збіраюцца сюды пакурыць і дзядзькі. Бо як жа іначай? Ліпа ж цвіце!..



ДРЭВЫ І ЛЮДЗІ

Якое падабенства між імі!

Ёсць гонкія, нібы выпеставаныя. Ёсць і так сабе.

А ёсць і гэткія, нібы ўвесь час нясуць на сабе нялёгкую ношку жыцця. Чамусьці да апошніх хілюся са шчырай павагай і заўсёды шапку гатоў зняць перад іх лёсам...

Неяк давялося забрысці ў мясціну, дзе астраўчане штогод спраўляюць святочныя гулянні. Стаяў на высокім беразе, глядзеў на вымытыя сонцам сосны і, прызнацца, адчуваў сябе, нібы на спектаклі, дзе і дэкарацыя, і думкі, і героі — прылізаныя. Таму, можа, больш ніколі не хадзіў туды.

А калі адвячоркам выпадала вольная часіна, ішоў да бярозы, што на самай прыазёрнай кручы, якраз насупраць калгаснай канторы. Садзіўся крыху воддаль і моўчкі глядзеў на яе бог ведае чым і калі пакалечаны камель, на крывыя, вузлаватыя, з іржавым накіпам галіны. Часам на верхавіну бярозы прылятала аднекуль зязюля і пачынала лічыць ёй гады.

Прыбягала сюды і Юлька, нячутна садзілася побач.

А зязюля ўсё лічыла і лічыла...

У такія хвіліны Юльцы, мабыць, таксама добра думалася. Ці мо ўспаміналіся расказы бацькі-партызана пра тое, даўняе, трывожнае, што некалі было на гэтай зямлі. Хто ведае...

На вулічных слупах запальвалася святло, і ад помніка над брацкай магілай да падножжа бярозы падаў трапяткі цень.

Мы падымаліся і моўчкі ішлі дадому.

А на зямлю асцярожна апускалася чуйная ноч...

ЖУКАВА ПОЛЕ

Трапіць на Жукава поле давялося значна пазней, чым думалася. І зноў з Юлькай. Праўда, некалькі разоў рабілася самастойная спроба, але варта было адарвацца ад вёскі, як арыенціры губляліся,— блытаўся на шматлікіх лясных сцяжынах і вяртаўся назад ні з чым.

У тую раніцу, лежачы на канапе-раскладушцы, чакаў, пакуль у суседнім пакоі прачнецца Юлька, і ўспамінаў нашу першую сустрэчу. Прызнацца, Юлька мне тады не дужа спадабалася — негаваркая, нібы ваўкаватая, яна больш слухала, чым гаварыла. Пра такіх у гэтых мясцінах кажуць: пастаў — стаяць будзе, пасадзі — сядзець будзе...

Але такою Юлька здалася толькі спярша. І хоць цяпер па-ранейшаму не выстаўляла сябе, але ў ёй ужо ўгадвалася натура, характар. Скажа — нібы звяжа. А калі не пагодзіцца з чым-небудзь, то не будзе выпінацца, даказваць сваё,— прамаўчыць. Толькі праз нейкі час, непрыкметна, а ўсё ж давядзе сваё да канца...

Думаючы гэтак, я і не пачуў, як Юлька зайшла ў мой пакой. Згледзеў яе ўжо ля стала — з конаўкай бярозавіку.

Заўважыўшы, што я не сплю, яна ўсміхнулася і прамовіла:

— Хочаш?

Бярозавік быў халодны — аж зводзіла сківіцы. І незвычайна духмяны. Я падзякаваў. Юлька зноў усміхнулася і сказала:

— Мо на Жукава поле пабяжым?..

...Лясная сцежка мокрая ад ранішняй расы. Зрабіўшы з дзесятак мудрагелістых паваротаў і перасекшы некалькі невялічкіх палянак, узгоркаў і пералескаў, мы неяк раптоўна выйшлі да палетка і спыніліся каля збажыны.

— Вось тут яно — Жукава поле! — сказала Юлька.

Гляджу, поле — як поле. Нічога асаблівага і адметнага.

Чаму ж тады ў Астраўку на кожным кроку гаварылі: Жукава поле ды Жукава поле...

Адчуўшы маё здзіўленне, Юлька пачала тлумачыць:

— Ішлі тут баі вялікія... Нашы заціснулі фрыцаў у гэтым кутку і давай калашмаціць! А тыя, вядома,— агрызацца...— Калупнула босаю нагою дол, нахілілася, падняла нешта з зямлі і дадала: — Тут нават зямліца напалову з жалезам...

На Юльчынай далоні ляжаў важкі асколак і чырванеў іржой. Юлька падкінула асколак у руцэ, нібы ўзважвала яго вартасць, і ціха прамовіла:

— Во як яно было тут...

— Ну, а Жукавым чаму поле завецца?

Юлька не адказала, а павяла мяне па сцежцы далей, туды, дзе ў канцы жытнёвага палетка стаяў каменны помнік-абеліск.

На ім залатымі літарамі было напісана: «Жукаў В. П.».

Мы стаялі і маўчалі. Мне думалася: пройдзе яшчэ столькі часу, яшчэ сто, тысячу гадоў, а гэтае поле ў знак удзячнасці людской так і застанецца Жукавым...

Нібы здалёк я пачуў Юльчын голас:

— Ён са звязкаю гранат... пад нямецкі танк... Жукаў...

А са збажыны даверліва пазіралі на нас васількі, і там-сям, нібы кроплі крыві, гарэлі палявыя макі.

ЛЯСНАЯ КАЗКА

Тут кожнае дрэва прызапасіла сюрпрыз.

Не-не ды і выйдзе з-пад дубка насустрач самавіты, у карычневым капелюшы, гномік-баравічок. Ён колькі дзён шукаў гэтай сустрэчы! І радуецца, нецярпліва парыпвае крамянай ножкай...

Падасінавік паводзіць сябе чамусьці сарамліва. Стане на леташнім лісці, у цяньку, і, чырванеючы, чакае: калі ты прыйдзеш, чалавеча?

А падбярозавікі — наадварот. Мітусяцца ў ломкай нізкарослай траве, пакуль не выстраяцца ў рад. Тады толькі пазіраюць на прышэльца, зухавата заламаўшы свае барэцікі...

Выбегуць на сцежку лісічкі-сястрычкі. Сабяруцца табунком і будуць аб нечым шаптацца... Яны — непаседы. На іх можна наткнуцца і ў сасонніку, і ў дубняку, і ў бярэзніку, і ў асінніку...

Затое грузды ў гэтых мясцінах любяць, як ніхто болей, цяністыя лагчынкі. Яны, тыя грузды, надзвычай гасцінныя. Кожны абавязкова прапануе сподачак, поўны духмянай халоднай расы...

І толькі рыжыкі не выбегуць на сустрэчу. Яны недзе там, на сакавітых балацінках, водзяць у гэты час казачныя карагоды...

Ты ведаеш пра іх клопат і не крыўдуеш.

НА ВЫСПЕ

Летні дзень, як год. Здаецца, нічога такога і не рабілі, а натупаліся. Таму, перш чым пайсці ў хату, мы з Юлькай прыселі каля нашай бярозы, і я адразу адчуў, што стома знікае.

Падышоў Арсен. Моўчкі пасядзеў хвіліну-другую і нечакана прапанаваў:

— А давай скокнем на Выспу!

Пра тую Выспу я чуў ад многіх тутэйшых людзей, але там не быў і таму з радасцю прыняў прапанову. Селі ў маторку і неўзабаве былі на месцы.

Калі наша «Казанка» ткнулася кілем у пясок, першая ступіла на пакаты бераг Юлька.

— Будзем рабінзонамі! — ускрыкнула яна.— Востраў бязлюдны!..

Некаторы час ішлі аднаму Арсену вядомай сцежкай, парослай маладым дубняком і ляшчынаю. Калі падняліся на самы высокі пагорак, ажно здзівіліся: перад намі ляжаў зялёны востраў, а наўкол, як кінуць вокам,— сінеча вады. Арсен хацеў хутчэй трапіць туды, дзе некалі былі партызанскія зямлянкі, але Юлька раптам паказала рукой на зараснікі.

Там, амаль упрытык да кустоў, на берагавым пятачку бялела палатка.

— Ого! — усміхнуўся Арсен.— А востраў абжыты...

Спусціліся ўніз, да чалавечага жытла. Акуратна развешанае на сукавінні паходнае начынне — кацялок, патэльня, капронавае вядзерца і яшчэ сякія-такія рэчы, складзеныя ля ўвахода ў палатку,— усё выдавала дбайнага гаспадара. Нібы ён толькі што разбіў свой бівак і адышоўся да возера змыць стому. Але старое вогнішча і гірлянда таранкі, што сушылася між арэшын, гаварылі іншае: чалавек тут атабарыўся даўно. Хацелі было падацца адгэтуль, але Арсен зазірнуў у палатку і ажно свіснуў:

— Дык гэта мой стары знаёмец-мастак!

Арсен трымаў над галавою полаг палаткі, і мы ўбачылі пасярод яе невялікі мальберт. Карціна была незакончаная, але ўсё ж абрысы яе праступалі даволі акрэслена і кідка. Арсен апусціў полаг і сказаў:

— Супынімся і мы тут...

Гаспадара не было доўга. З'явіўся толькі тады, калі за лес, на тым беразе, апусцілася сонца, а прыбярэжны чарот пачаў ахутвацца лёгкім туманам. Човен прыплыў нечакана, нібы з легенды, і чалавек ступіў на бераг нячутна, па грудзі ў тумане, барадаты і шыракаплечы, як той Садко. Наблізіўся да нас і, пазнаўшы Арсена, усміхнуўся:

— Я даўно заўважыў, што на востраве прышэльцы. Ды акуні браліся, як шалёныя...



— А чаму хату маю мінуў? — запытаўся Арсен.

Барадач кінуў на траву рыбу, усім па чарзе падаў шырокую і моцную руку, прысеў побач.

— Турбаваць не хацеў,— нібы апраўдваўся ён.— Спярша сюды пацягнула...

Арсен прамаўчаў, толькі па-сяброўску цёпла глянуў на гаспадара. А той гэтак жа моўчкі пазіраў то на Арсена, то на мяне, то на Юльку, і відно было, што ён ці то заклапочаны, ці то разгублены.

Раптам чалавек падхапіўся, кінуўся ў палатку і тут жа выбег з блакнотам у руках. Юльцы сказаў:

— Фея, прашу не варушыцца! Я — толькі хвілінку...

Імкліва забегаў па аркушыку паперы аловак.

— Вось гэта тое, што трэба! — гаварыў барадач.— Тое, што шукаў і летась, і пазалетась... Малайчына, фея! І адкуль ты ўзялася на маю галаву? Цудоўна!.. Я вельмі ўдзячны табе... Перанясу цябе на палатно... Абавязкова...

Ён раптам адкінуў аловак і сядзеў ужо нейкі час паніклы і сцішаны. І Юлька не варушылася, мабыць, не разумела, што да чаго. Толькі Арсен паглядаў на сябра з нейкай затоенай павагай. А барадач маўчаў. Маўчаў і тады, калі распальвалі вогнішча, калі варылася юшка, калі вячэралі. Я глядзеў на яго твар, злёгку асветлены вогнішчам, і не мог здагадацца, у чым справа. Чала-

век настрою? Ці крыўдуе, што патрывожылі яго адзіноту?

І чаму ён гэтак да Юлькі?..

Недзе ўжо спаў у палатцы Арсен. Згарнуўшыся калачыкам, падклаўшы пад галаў рукі, ляжала на посцілцы ля вогнішча Юлька і, мабыць, таксама спала. Толькі мы з барадачом сядзелі адзін супраць аднаго, цераз касцёр і, як нямыя, маўчалі.

Раптам ён сказаў:

— Вось так, дарагі... На гэтай Выспе нас аблажылі ў сорак трэцім... Лічаныя засталіся ў жывых. І дзяўчынка была з намі...— Ён падгарнуў агаркі і ціха дадаў: — Усё жыццё лічыў абавязкам напісаць тую страшную ноч. І людзей тых, якія стрывалі такое. Цяпер, здаецца, знайшоў, што трэба... Дзякуй вам... І феі дзякуй...

Неба на ўсходзе пачынала святлець. Бралася на дзень...

БУСЯ

— І чаго трэшся ля ног? — незлабліва пыталася Юльчына маці.— Зноў лодкі правяраў? Нажэрся той рыбы, а цяпер яму малака падавай! Валацужнік гэткі!..

Мікіта пакрыўджана прайшоўся па хаце, ускочыў на падаконнік і пачаў умывацца.

— Апсік! — зноў не ўтрымалася маці.— Гасцей наклічаш яшчэ!.. А ў мяне вунь буракі ў сурэпцы тонуць...

Адчыніліся дзверы, і ў хату ўбегла Юлька. У мокрым ад ранішняй расы прыполе — яна толькі што адвяла на выган бычка — Юлька трымала бусляня.

— Чарцянё, а не дзеўка! — успляснула маці рукамі.— І навошта спарола яго?

— Я не спорвала! — Вочы ў Юлькі поўныя таямніцы і нязвыклай радасці.— Бегла праз дворышча дзеда Нупрэя і ў траве ўбачыла...

— У траве, у траве! — лагаднела маці.— Вось прыйдзе бацька, ён табе дасць...

Але Юлька не слухала яе. Апусцілася на падлогу і пачала разглядаць бусляня. Хоць было яно добра апеpанае, але не магло яшчэ ўстояць на цыбатых нагах — валілася то на адзін, то на другі бок.

Юлька пасмяялася такой нязграбнасці і пачала суцяшаць:

— Ну чаго ты, Буся?..

— Во! Ужо імя прыдумала! — сказала маці і, выходзячы з хаты, кінула Юльцы, нібы між іншым: — Прыйдзе бацька, то няхай на буслянку падсадзіць... Я ў буракі пабегла!..

Юлька чула і не чула матчын наказ. Сядзела на падлозе, гладзіла мокрыя птушыныя пёры, чырвоныя, нібы азяблыя, ногі і радавалася: такога ў яе жыцці яшчэ не было! Некалі, праўда, дзядзька Арсен даў патрымаць дзікае качаня, паймала на гарышчы аднойчы галубку, а вось каб бусел!..

Прытуліла цёплую птушыную галаву да шчакі і заплюшчыла вочы...

Апоўдні, учуўшы пра навіну, да іх зайшоў дзед Нупрэй. Не сказаў «дабрыдзень», а толькі моўчкі кіўнуў галавою, прысеў на лаву, пасмактаў піпку, напусціў вакол сябе сіняга дыму і, не звяртаючы ўвагі ні на Юльку, ні на тое бусляня, прамовіў:

— Сапхнулі, кажаце?.. Яны гэта робяць! Калі сухмень чакаецца...

Як дыму стала яшчэ болей, дадаў:

— Ого, бусел! Вумная птушка!.. Помню, адзін год пяцёра спачатку было. Потым адразу дваіх сапхнулі... А праз які тыдзень — трэцяга... Двойня толькі і паднялася на крыло... І праўда, картопля была ў боб!..

— А мо і сапраўды падсадзіць у кубло? — прапанавала дзяўчынка.

— Куды? У буслянку? — ажывіўся Нупрэй.— Задзяўбуць! Самім трэ выхадзіць!..

— А дзе тых жаб набярэшся?

— А ты картопляй кармі. Што парасяці, тое і яму давай. Рыбы калі ці яшчэ чаго...

Даўшы такую параду, дзед Нупрэй пайшоў, а Юлька, задаволеная, што так усё абярнулася, адгарадзіла бусляняці закутачак і выбегла на вуліцу. Хутка ўся вёска ведала пра Юльчыну радасць. Калі вярнулася з буракоў маці, то ўбачыла поўную хату дзятвы. Пасярод кухні стаяла міска з рыбінай драбязою, а Буся — абсохлы і папрыгажэлы — цікаўна паглядаў паверх дзіцячых галоў...

...Праз які тыдзень Буся зусім прызвычаіўся да новага жыцця, падружыўся не толькі з Юлькай, але і з катом Мікітам. І Юлька ўсё часцей і часцей выводзіла яго за веснічкі. Яны звычайна ішлі спачатку на прычал. Там, у рыбацкіх лодках, можна было знайсці якую спажыву. Мікіта бег за імі таксама і ад радасці толькі вуркатаў...

З прычала яны кіравалі на выган і там гулялі. Буся няўклюдна бегаў за Юлькаю, смешна пасабляючы крыламі... Аднаго разу ён не разлічыў, разбегся мацней звычайнага і, на здзіўленне Юльцы, праляцеў ажно да самага ўзлеску. Калі да яго падбегла Юлька, Буся ўпершыню паглядзеў на яе з яўнай перавагай.

А той дзень Юлька ніяк не магла забыць. Яны ледзь не з раніцы бавілі час на выгане. Буся хадзіў па траве і збіраў цвыркуноў, а Юлька рвала шчаўё. Раптам яна пачула вясёлы буслінЫ клёкат. Падумала спачатку, што гэта Буся, але азірнулася і ўбачыла: высока ў небе кружылі Нупрэевы буслы, а бусліха стаяла ў гняздзе і радавалася — клекатала на ўсю акругу.

Буся пакінуў свой клопат і таксама паглядзеў у неба. А потым не вытрымаў, неяк таропка разбегся і нечакана падняўся на пругкае крыло. Зрабіў над выганам круг і ўзяў кірунак да Нупрэевай хаты. Юлька бачыла, як ён там, у небе, далучыўся да сваіх, згубіўся ў тым гурце, і праз хвіліну ўжо не разабраць было, каторы з іх Буся.

Юлька да самага вечара прасядзела на выгане, чакаючы, што Буся вернецца. Але ён не вярнуўся. І Юльцы было радасна і тужліва...

У ДЗІЦЯЧЫМ ЛЕСЕ

— А ў дзіцячым лесе Вера-вавёрка жыве! — сказала аднойчы Юлька і папрасіла: — Давай пабяжым туды, гасцінец занясём...

Цікава было паглядзець і на той «дзіцячы лес», і на тую Веру-вавёрку, і я згадзіўся. Юлька, радая, што можа пахваліцца яшчэ адным сваім адкрыццём, хуценька ўзабралася на вільчык хлеўчука, дастала з патайнога месца бляшанку з-пад кансерваў, перасыпала з яе нешта ў хусцінку, з'ехала па саламянай страсе на дол і сказала:

— А яна ўсё чыста забярэ!..

Неўзабаве мы ўвайшлі ў лес. Брылі мо хвілін дзесяць борам, і ўвесь гэты час мне рупіла запытацца: што за гасцінец Юлька прызапасіла? Але толькі пацікавіўся:

— Ці не гэта твой дзіцячы лес?

— Не. Ён такі, — рукою дакранулася Юлька да маіх грудзей. — І ўвесь новенькі.

Неяк раптоўна мы апынуліся на невялікай палянцы. Перад намі ляжала колішняе ляда, парослае рэдкім каржакаватым дубнячком. Толькі правая палавіна таго былога ляда кідка зелянела зараснікамі ляшчыны, а ўпрытык да яе стаяў стары, разгалісты дуб.

Крокаў дваццаць мы не дайшлі да таго дуба,

як Юлька спынілася і развязала вузельчык: некалькі кавалачкаў цукру, жменька леташніх арэхаў і пернік... Сапраўды выключны пачастунак!

Юлька сказала:

— Лягай у траву, а я панясу, пакладу ёй.

З травы мне добра відаць было, як Юлька расцілала ля камля хусцінку з пачастункам, і думалася чамусьці, што ўсё гэта — марны занятак.

Юлька неўзабаве вярнулася, села побач і нечакана паклікала:

— Вера-ва-вёр-ка!.. Вера-ва-вёр-ка!..

Але тая чамусьці не паказвалася. І толькі калі дзесьці на верхавіне дуба праявіла сваю пільнасць сарока, абвясціўшы на ўсё наваколле пра наш з Юлькай прыход, у круглай дзірачцы дуплянкі з'явілася хітраватая мордачка. А праз хвіліну затанцавала на суку і сама гаспадыня — вавёрка.

— Верачка! — абрадавалася Юлька.— Мы гасцінец табе прынеслі!..

Вавёрка паглядзела на Юльку і цокнула — нібы лузнула арэшак. Потым асцярожна спусцілася па камлі на дол і, не звяртаючы ўжо на нас увагі, пачала завіхацца ля хусцінкі. Спатрэбілася некалькі рэйсаў, пакуль гасцінец быў перапраўлены ў дуплянку. Тады вавёрка з'явілася зноў і весела зацокала, танцуючы на суку.

Нібы дзякавала Юльцы за пачастунак.

РАКІ

— І чаму яна дзеўкаю нарадзілася? — ушчувае маці Юльку.— І чаму не хлопцам? То бусляня спора, то з вудаю цалюткі дзень швэндаецца, то па хлявах лазіць...

Мне відно з прачыненых дзвярэй: Юлька сядзіць на кухні і толькі шморгае носам. А маці не перастае:

— Гора ты маё горкае! Чаму ў іншых — дзеці залатыя. Ад маці не адбягуцца. Куды яна, туды і яны. А я ўжо на сваю галаву дачакалася, што людзі пачалі запыняць на вуліцы...

Юлька яшчэ мацней шморгае носам.

— І на якое ліха тыя ракі табе даліся? — зноў дакарае маці дачку.— Не было куды рукі ўперці?

Юлька слухае папрокі, насупілася і пазірае ў акно.

— Во! Адвярнулася ўжо! — не сунімаецца маці.— А мне Абора праходу цяпер не дае!.. Ён жа тых ракаў мо з тыдзень вышморгваў!

— І не тыдзень, а два дні! — раптам удакладняе Юлька.

— Два дні! — як не крычыць маці.— А цяпер што? Ну, скажы ты мне: што будзе цяперака?

— Нічога не будзе! — ледзь не плачучы, ад-

казвае Юлька.— Наглуміць за выхадны, калі захоча!..

— А ты зноў выпусціш? Скажы: выпусціш?— дапытваецца маці.

— А нашто яму столькі? І яшчэ ў скрынкі пазапіхаў...

— А ты ўцікавала і выпусціла? — ужо з прыкметнай смяшынкай у голасе пытаецца маці.

— Вы-пу-сці-ла! — выціраючы далоняй твар, адказвае Юлька.— Бо шкада было. У скрынках жа!.. Мучыліся...

— Шкада, шкада! — лагаднее матчын голас.— Я табе пашкадую! Гэць з хаты, пакуль за ручнік не ўзялася!..

Бразнулі дзверы, і на кухні стала суцішна.

Калі я выйшаў на падворак, Юлькі нідзе не было. Няўжо пабегла ў кузню да бацькі?

Але Юлька сядзела на вільчыку хлеўчука і, нібы нічога не здарылася, спакойна паглядала на неба.

ТАНЕЦ ГРЫБОЎ

Юлька — выдумшчыца.

Юлька — фантазёрка.

Учора яна сказала:

— Хадзем у гай, паўзіраемся, як грыбы танцуюць.

— Ці ж грыбы ўмеюць танцаваць?! — засмяяўся я.

— Яны ўсё ўмеюць! — усміхнулася Юлька.— Дай управіцца па хаце — і пойдзем...

Калі ў хаце было прыбрана, мы адправіліся ў лес.

Вось і знаёмая палянка. Юлька зірнула туды, зірнула сюды і, нібы на правах старэйшай, прапанавала:

— Прысядзем вунь пад таею елачкай і пацікуем. Вылузнецца сонца, і тады...

Сапраўды, толькі з'явілася сонца, як уся палянка залілася праменнямі. І я заўважыў: з-пад леташніх лістоў пачалі выбягаць лісічкі... Ударылі ў свае смычкі цвыркуны, забіў у бубен дзяцел. А лісічкі, пабраўшыся за рукі, закружыліся ў карагодзе...

Юлька шэптам гаворыць:

— А зірні, які хлапец-маладзец з'явіўся!

Я азірнуўся.

На ўскрайку паляны стаяў мухамор. У стракатым капелюшы. Выгляд у яго быў такі фанабэрысты, што я засмяяўся:

— Стыляга нібыта...

— Ага, стыляга,— пагадзілася Юлька.— А цяпер паглядзі сюды! Парахня сыплецца, а туды ж...

З лясной сцежкі сіліўся падняцца дзядок-баравічок.

— Ён зачапіўся за галінку і спатыкнуўся,— зноў засмяялася Юлька.— Ажно шапка звалілася!

А лісічкі, не зважаючы ні на што, усё кружыліся і кружыліся ў сваім танцы. Недзе па-ранейшаму біў у свой бубен дзяцел, і ажно заходзіліся смычкі цвыркуноў...

Калі сонца нечакана схавалася, цвыркуны, дзяцел, дзядок-баравічок, фанабэрысты мухамор і нават лісічкі-сястрычкі са сваім казачным карагодам — усё гэта некуды знікла.

Юлька зірнула на мяне. Яна была шчаслівая. Яна паказала мне танец грыбоў!..

БЕССМЯРОТНЫ ДЗЕД

Аднойчы я даведаўся ад Юлькі, што дзеда Нупрэя называюць яшчэ і Бессмяротным. З якой гэта нагоды прыжылося за ім такое прозвішча, Юлька растлумачыць не магла, а запытаць у каго іншага ці ў самога Нупрэя неяк не выпадала. Да таго ж, прызнацца, баяўся пакрыўдзіць старога. Бо, чаго добрага, думаў я, «Бессмяротны дзед» — гэта мянушка. А ў той дзень неяк само сабой сталася, што мы разгаварыліся з Нупрэем, і я ўзяў і асмеліўся:

— А скажы, дзеду, чаму гэта вас Бессмяротным велічаюць?

Нупрэй калупнуў кіем зямлю, нібы разважаючы: адказваць ці не на такое пустое пытанне, а потым сказаў:

— А я, гэтае самае, і ёсць бессмяротны...— Ён зняў з галавы нязменную аблавушку, паклаў на калені, абапёрся на кіёк і, пазіраючы некуды ўбок, пачаў: — У сорак трэцім тое было. Улетку. Хлопцы нашы якраз за маёю хатай немчука аднаго падстрэлілі. Хацелі і бобікаў, паліцаяў, пабіць, але тыя паўцякалі... Дык бобікі прыперліся назаўтра і зграблі ўсю маю сямейку... Павялі, адным словам... І мяне, і маю Марфу, і Ваньку з Лідкай... Лідцы тады гадкоў пяць было...



Нупрэй палез у кішэню па капшук, раскурыў піпку, адкашляўся і нібы спалохана паглядзеў на мяне:

— Адным словам, па сённяшні дзень караю сябе... Мо каб не я, то жылі б і цяпер мае... І Лідка не мучылася б столькі. З паўвярсты адышліся мы тады ад Астраўка, а я вазьмі ды шапні сваім: усё роўна, кажу, канец. Калі ўвойдзем у лясок, рассыпайцеся, кажу, хто куды... А ўвайшлі ў той лясок — толькі паглядаю на сваіх, а скамандаваць не рашаюся... Не, чалавеча, я паміраць не баяўся! Дзетак шкадаваў. І Марфу. Мо, думаю, абыдзецца... Мо, думаю, завядуць у той гарнізон і адпусцяць... А яны...

Кіёк у дзедавых руках стаў уздрыгваць, і Нупрэй, каб не выдаць сябе, зноў прыняўся калупаць ім зямлю.

— А яны,— нібы здалёк пачуўся Нупрэеў голас,— а яны паставілі нас над ровам і пачалі страляць... Спачатку Марфу... Тады пытаюць у мяне: «Дзе партызаны?» А што я мог сказаць? Маўчу. І ногі нейкія дзеравянныя зрабіліся... Толькі Лідку, помню, прытуляю да сябе...

Па даўно не голенай і запалай Нупрэевай шчацэ скацілася на пясок сляза. Я ўздыхнуў.

— Потым Ваньку майго... І зноў: «Дзе партызаны?!»

Нупрэй дастаў карычневую хусцінку, выцер твар і дадаў:

— А як нас з Лідкаю стралялі — не ведаю

нават. Таўканула толькі, помню, у грудзі, і стала больна...

Юлька сядзела насупраць, у траве, і пагладала то на мяне, то на Нупрэя. Вочы вялікія, спалоханыя, сама сціснулася ў камячок, бы тое птушаня, што яшчэ лятаць не навучылася.

Нупрэй выбіў піпку аб кіёк і загаварыў больш спакойна:

— Бабы з сяла поначы прыйшлі. Каб закапаць, значыць... А мы з Лідкаю — жывыя... Варушыліся... Лідцы тады ў скіўіцу папала... Разрыўной... Так і пакутавала да леташняй зімы калекаю...

Я ўспомніў пра нядаўняе вяселле ў Нупрэевай хаце, пра Сашка з Ганначкаю і пацікавіўся:

— А Ганначка? Унучкай даводзіцца?..

— Яна, гэта самае, прыдбаная... З сіроцкага дома Лідка ўзяла...— ледзь чутна адказаў Нупрэй.

Потым, нібы гаворка ішла не пра яго, а пра некага іншага, дадаў:

— А Бессмяротны дзед яшчэ тупае па зямлі... Трэба тупаць...

СМУТАК

На балацінцы, што ляжала ў трыкутніку між дарогай, лесам і рачулкай, жыло шмат вужоў. Кожны з іх меў свае, уласцівыя толькі яму, завушніцы — белаватыя, жоўтыя, нават ружовыя.

Юлька прыбягала сюды і гадзінамі назірала за тымі вужамі.

А ў тую вясну квяцістую балацінку аблюбавалі яшчэ два прышэльцы — танканогая козачка і андатра, ці балотная бабрыха, як тут называюць гэтага звярка. Мясціна прыйшлася ім даспадобы, і спачатку козачка, а потым і бабрыха прывялі дзіцянят. Козачка — двое, бабрыха — ажно сем. Козачка зрэдку дазваляла сваім дзецям выбягаць на сонечны пятачок і крыху пабегаць адзін за адным сярод лугавых кветак. І хоць там, на дарозе, час ад часу вуркаталі машыны, казляняты не зважалі на гэта — падбрыквалі і падбрыквалі, на радасць маці. Юльку яны, праўда, пабойваліся. Варта было ёй падняцца з купіны, каб працягнуць руку і пагладзіць якое з іх, як яны знікалі ў зарасніках.

Бабраняты жылі ў спакайнейшым месцы — у лазовым кусце, што спускаўся аж да самай вады. І толькі Юлька затоіцца на беразе, як бабраняты высыпалі з-пад таго куста чарнаватымі ка-

мячкамі, плюхаліся ў ваду і плылі, смешна выставіўшы свае цікаўныя пысачкі. Маці сядзела на беразе, секла асаку і нібы не звяртала ўвагі ні на сваю драбязу, ні на Юльку. І Юлька была рада.

З асаблівай цікавасцю назірала яна, калі камячкі-бабраняты падплывалі да лілеяў і, выбраўшы кожны сабе асобны лісток-далонь, спыняліся і пачыналі прыхарошвацца. Спачатку тонкімі пальчыкамі расчэсвалі галоўкі, потым — бакі, а потым і жывоцікі. Стаўшы на заднія лапкі, яны акуратненька перабіралі, здавалася, кожную варсінку, прыгладжвалі свае кажушкі і тады толькі давалі нырца і плылі да маці — пасмактаць малака. Юлька не хацела трывожыць іх, падымалася і паціху, каб не трэснуў які сучок пад нагою, выходзіла на дарогу і бегла, шчаслівая, дадому.

А ў той дзень яна была сама не свая. Сустрэла мяне на дарозе і — у слёзы:

— Бабраняты пагінулі... І казлянятак няма-шака...

Я ведаў, што ў гэтых мясцінах дужа сурова пачалі абыходзіцца з андатрай. Пасялілася яна, на радасць чалавеку, у азёрах і рэчках, размножылася і стала назаляць браканьерам. То сеткі парэжа, то жакі пасячэ... І браканьеры сталі знішчаць андатру, а з яе футра шыць ноские, шыкоўныя шапкі. Канечне, лаўцы, не задумваючыся, маглі падняць руку і на казачку... Але што я мог адказаць Юльцы? Як суцешыць яе?..

МАРА

Яна стаяла ля берага — лёгкая, чыстая, светлая...

А ў мяне расла і расла рэўнасць. Да возера, якому дазваляла яна цалаваць свае ногі, і нават да вечара, які зрываў з неба зялёныя зоры і шчодра ссыпаў ёй на дрыготкі прыбой...

Раптам захацелася сабраць тыя зоры, нанізаць у каралі і павязаць ёй — на зайздрасць усім. Толькі памкнуўся — упала на пругкія хвалі, засмяялася і знікла з вачэй. І не стала больш ні салаўя, ні зор, ні маёй мары.

А мне і цяпер верыцца: яна прыплыве яшчэ да майго берага...

ЧМЯЛІ

Юлька сядзела на выгане і цікавала за чмялямі.

Яны рупна снавалі між кветак і, здавалася, не звярталі на Юльку аніякай увагі. Праўда, адзін чмель усё ж заўважыў яе, падляцеў і, выбраўшы самую прыгожую кветку на Юльчыным плацейку, сеў і пачаў поўзаць па ёй.

— Во дурненькі! — засмяялася Юлька і датыкнулася да чмяля.— Кветка ж нежывая!..

Чмель падхапіўся, нездаволена бомкнуў і паляцеў. Юлька правяла яго позіркам і раптам успомніла, што даўно не падглядала сваіх чмялёў.

Дзяўчынка пабегла на кручу. Там, у камлі старой бярозы, жыла цэлая сям'я чмялёў, і Юлька не раз частавалася іх мёдам. Трэба было толькі ўзяць дубец, легчы на дол, асцярожна выграбці з парахні чмяліныя кадушачкі, і мёду таго — колькі сабе захочаш!..

Вось і зараз Юлька здзьмула з тых кадушачак і чмялёў, і парахню, адкусіла травінку і хацела апусціць яе ў самую вялікую кадушачку, як раптам пачула:

— А што гэта, Юлька, ты парабляеш тут?

Азірнулася і ўбачыла дзеда Нупрэя. Ён стаяў

над кручай, у некалькіх кроках ад яе, і ўдакладняў:

— Пытаюся, што парабляеш тут?..

— Мёд выбіраю,— сказала Юлька, але не паднялася, не падышла да Нупрэя. І тады Нупрэй, прыпадаючы на параненую нагу, спусціўся па схіле і прысеў побач з Юлькай.

— Пасмакчы, дзеду! — прапанавала Юлька і працягнула Нупрэю чмяліныя кадушачкі.— Салодкі!

— Вядома, што салодкі! — адказаў Нупрэй, але кадушачак не ўзяў.— Мёд, адным словам, і ёсць мёд...

Юлька паднялася з зямлі, прысела на пяньчук і зноў прапанавала:

— Пасмакчы!

— А няхай цябе, Юлька! — засмяяўся Нупрэй, ды на гэты раз узяў з яе рук і кадушачкі, і травінку. Але колькі ні стараўся, а пакаштаваць мёду не змог.

Юлька праверыла ўсе кадушачкі і таксама не змагла паспытаць тае смакаты — кадушачкі былі пустыя.

— Яно вядома! — сказаў Нупрэй.— Сухмень стаіць. Арсен вунь пчол і тых штодзень чаем поіць...

Праз якую гадзіну той-сёй з вяскоўцаў, напэўна, бачыў, як на кручы, непадалёку ад старой

бярозы, ляжалі два чалавекі — стары і малы — і паціху размаўлялі між сабой.

— П'юць? — пытаўся адзін.

— П'юць! — адказваў другі.

Крокі за два ад іх, на пеньчуку, стаяла бляшанка. На яе раз-пораз апускаліся рыжыя чмялі і, пасядзеўшы крыху на саломінках, што плавалі ў той бляшанцы, падымаліся і знікалі ў камлі старой бярозы.

— Носяць! — чуўся ўсхваляваны вокліч.

— А няхай цябе, Юлька! — адказваў хрыплавата Нупрэй.— Старога, а на такую спакусу навяла...

ЦЫГАНСКІ БАРОН

Ён з'явіўся нечакана.

У нядзелю да затокі падляцела легкавушка, высадзіла цыбатага дзецюка з манаткамі і шмарганула назад, у горад. Дзяцюк патаптаўся ля берага, доўга не думаючы, дастаў палатку і разбіў свой табар.

Праз якую гадзіну там ужо курыўся дымок і верашчаў транзістар.

Надвячоркам наступнага дня зноў з'явілася легкавушка, і вышэй узвіўся дымок, а да вёскі далятталі ўжо адчайная бранкатня гітары і асіплыя спевы:

Я — цыганскі барон...

Барону падпявала некалькі мужчынскіх галасоў. І было гэта так нязвыкла для тутэйшых мясцін, што людзі пачалі ўжо выказваць нездавальненне:

— Гэты Барон паводзіць сябе дужа нахабна...

Юлька таксама зацікавілася прыезджым. Ішла аднойчы берагам затокі і заўважыла ля затухлага вогнішча добрую жменю лінёвай лускі. Ліні, разважала яна, цяпер і не думаюць брацца на вуду.

Адкуль жа гэты Барон узяў іх?

Абышла ледзь не ўвесь бераг затокі, углядаючыся ў ваду. І там, дзе затануў некалі альховы вываранень, убачыла пенапластавыя паплаўкі. «Сетка!» — здагадалася дзяўчынка.

Такое стрываць было нельга. Яны, хоць і жывуць пры вадзе, ніколі не карысталіся забароненым ловам рыбы. Лічылі гэта злачынствам. А ён? І яшчэ храпе ў сваім шатры спакойненька...

Юлька адшукала Арсена, яны раскатурхалі разамлелага пасля ўчарашняй пагулянкі Барона і сказалі:

— А ну, даставай сваю згубу!..

Барон залыпаў вачыма, але ўбачыў строгі Арсенаў твар і вымушан быў выцягнуць з вады шыкоўную капронавую трыгубіцу. У ёй білася каля дзесятка залацістых лінёў.

Арсен вызваліў з капронавага павуціння рыбу, а Барону прапанаваў пакінуць гэтыя мясціны неадкладна.

З тае пары цыганскі Барон сюды і носа не патыкае.

ЧАБАРОВЫ БЕРАГ

Той бераг возера — пакаты. Там — спрадвечнае царства вялізных зялёных лягушак. Калі зацвітае лотаць і лягушкі збіраюцца ў затоках ніzаць на маладую траву жабурынне, над зямлёю стаіць такое крумканне, што ажно нервуюцца Нупрэевы буслы...

А гэты бераг — наадварот, высокі, ■ барамі, дубровамі і спрэс укрыты фіялетавым чабаровым дыванам.

Калі чабор зацвітае, Юлька прыходзіць сюды, ірве яго, а потым маці парыць з ім гліняныя гладышкі з-пад малака.

Але часцей за ўсё бярэ Юлька чабор для таго, каб занесці на гарышча і высушыць на заварку да чаю.

Праўда, Юлька ведае, што чай з аднаго чабору — гэта яшчэ не чай. Сапраўдны лясны чай атрымаецца тады, калі да чабору дадаць пучок залацістага зверабою, столькі ж чарнічніку, ліпавага цвету, сунічніку, жменю сушанай шыпшыны ды два-тры каліўцы зубровай травы. Упрэе ўсё гэта ў чыгунку, адстаіцца, і маці разалье настой у шклянкі — здзівішся і колеру, і паху... А смак які! Вып'еш з мёдам таго пітва — куды падзенецца смага!

Стому таксама лясны чай здымае.

...Я ляжаў на чабаровым дыване, пазіраў, як ірвала Юлька тую траву, і міжволі прыгадваўся вечар, калі ўпершыню частаваўся лясным дарункам.

Сэрца поўнілася вялікай павагай да людзей, што данеслі да нашых дзён тую няхітрую завядзёнку далёкай даўніны.

АЛЬМА

Яна не магла дачакацца тае хвіліны, калі адчыняцца дзверы і з хаты выйдзе Юлька, паставіць перад ёю міску з пачастункам, прысядзе на кукішкі і будзе глядзець, як яна, Альма, снедае. Калі міска апаражнялася, Юлька даставала з-за пазухі дудачку, і падворак напаўняўся дзівоснай мелодыяй.

Альма не вытрымлівала спакусы, садзілася насупраць і, падняўшы галаў, пачынала падпяваць.

Людзі спыняліся па той бок паркана і ўсміхаліся яе такому нязвыкламу занятку.

А ў тую раніцу Альме не хацелася, каб Юлька выходзіла з хаты, не хацелася, каб даставала сваю дудачку...

Яшчэ звечара адчула, што з ёю нешта нядобра. Кружылася галава, у вачах стаяў туман, нутро паліла смага, і нудзіла. Пабегла да возера — да болю ў жываце хлябтала і хлябтала ваду, а смагу так і не магла наталіць. Прыплялася дадому, скруцілася абаранкам на жменьцы леташняй саломы і праляжала да раніцы, так і не зразумеўшы, што з ёю сталася.

Да таго ж недзе там, усярэдзіне, расла злосць і на тую валацужніцу-сучку, з якой надоечы ад

няма чаго рабіць скубануліся ўсяго які раз, і на ўсіх чыста — нават на тых незнаёмых людзей, што недзе нягучна бразгалі вёсламі... А калі ўбачыла на парозе не Юльку, а Юльчыну маці, са здзіўленнем прыўстала на пярэднія лапы, хацела рванууца, схапіць за руку, але апамяталася і ўсяго што зрабіла — агрызнулася.

А Юльчынага бацьку і зусім не прызнала. Здалося, што гэта нехта чужы і нядобры, і яна кінулася на яго, учапілася ў крысо пінжака, ды знаёмы пах ацвярэзіў — адскочыла і вінавата падцяла хвост.

Потым, нібы праз сон, убачыла яна яшчэ і Арсена.

Ён стаяў з гаспадаром пасярод падворка і гаварыў:

— Вядомая справа!.. Трэба ісці па фельчара... А калі не вылечыць, то...

Вось ужо зніклі і гаспадар, і Арсен, а перад вачыма стаяў адзін толькі туман. І скрозь гэты туман яна ўжо не бачыла, як прыбегла пад паветку Юлька,— адчула толькі паспешлівы дотык дзіцячых рук ды пачула знаёмы голас:

— Уцякаць табе трэба... У лес...

Калі на ланцужку шчоўкнула прышчэпка, яна ўся неяк сцялася і быццам прачнулася, быццам зразумела што да чаго. Хацела лізнуць Юльчыну руку, але раздумала і, нібы вінаватая ў нечым перад ёю, паслухмяна пакінула зялёны падворак...

...З таго дня прайшло доўгіх два тыдні. Кожную раніцу Юлька выходзіла з хаты, садзілася на прыступкі ганка і маўкліва пазірала наўкол. Сцежкаю, па той бок паркана, як і раней, ішлі на працу знаёмыя людзі, спыняліся насупраць і гаварылі:

— Не чуваць нешта нашых артыстаў...

Юлька не вытрымлівала, падымалася і бегла ў хату.

А на гэты раз Юлька толькі адчыніла дзверы — і да ног кінулася Альма. Схуднелая, але вясёлая, яна і скавытала, і лашчылася, і ўсё мерылася лізнуць у шчаку...

ЗМЯЯ НА ВУДЗЕ

Надвячорак выдаўся на дзіва спакойны. Яшчэ зусім нядаўна бушаваў вецер, намагаўся прыгнуць да зямлі дрэўцы. Потым нечакана суцішыўся, нібы стаў прыслухоўвацца, як з хмары асыпаюцца на зямлю кроплі дажджу. Не сваволіў ён і потым, калі хмара сплыла за возера і на небе зноў паказалася яркае сонца. Радая такому Юлька ўхапіла вуду і пабегла на возера.

Толькі яна дарэмна спяшалася. Нават акунькі не жадалі чапляцца.

«А мо пайсці ў ляшчыннік? Мо зірнуць, колькі арэхаў маланка спаліла?»

Толькі падумала так, і адчула, што нехта тузае за вудзільна. Зірнула — і ледзь не войкнула. Кончык вудзільна сагнуўся, а капронавая лёска ажно свістала, разразаючы ваду.

Юлька пачала цягнуць. Яна — к сабе, а рыбіна — к сабе. Нарэшце нехта доўгі, вялізны і дужа неспакойны мільгануў у паветры і бразнуўся вобзем. Падбегла Юлька да таго месца, дзе ўпала рыбіна, як раптам ажно збялела ад нечаканасці: «рыбіна» вужакай паўзла да вады...

— Змяя! — ускрыкнула Юлька і кінулася прэч.

Але хутка апамяталася, вярнулася назад, уха-

піла вуду і пабегла, адчуваючы, як ззаду, на прывязі, матляецца нешта цяжкое. На падворку кінула вуду, убегла ў хату і закрычала:

— Там, ля ганка, змяя круціцца!..

Маці выскачыла на парог, зірнула — і ўсё зразумела. Падышла, згрэбла пярэстую ад пяску «змяю», укінула ў прыпол фартуха, а дачцэ спакойна сказала:

— Дурненькая, гэта ж не змяя, а вэнгар... Вугор.

...Юлька ўспамінае той незвычайны выпадак і смяецца:

— А праўда, дурная тады была. Ведала, што ў азярові водзіцца такая рыба, а напалохалася...

А маці з сумам гаворыць:

— Згінуў цяпер вэнгар. Бо каналы перасыхаюць... І яшчэ заставак розных панараблялі — не дапяць яму сюды. А некалі ў жакі во як залазіў!..

— А як наконт арэхаў? — пытаюся.

— Ого! — зноў ажыўляецца яна.— Бывала, усю зіму лускалі. А цяпер...

Юльчына маці хвіліну-другую маўчыць, а потым, у роздуме, нібы няўпэўнена, кажа:

— Цавілізацыя...

Хачу запярэчыць: маўляў, і балоты асушваць трэба, і лясы ў парадак прыводзіць, але яна перабівае:

— Маглі б і не чапаць ляшчыны...

ЗЯЗЮЛЬЧЫНА ДАЧКА

Нупрэй ішоў торнай лясной сцяжынкай, час ад часу пасабляючы сабе ядлоўцавым кійком. Хада была лёгкая, спружыністая. Нібы што прыспешвала чалавека. І ён толькі зрэдку кідаў позірк то направа, то налева — як гаспадар, якому ўсё тут знаёма да драбніц. Нарэшце Нупрэй заўважыў мяне і неяк знячэўку спыніўся.

— Іду ажно ад Жукава поля,— нібы апраўдваўся ён.— І ўсё думаю: каб не размінуцца, каб застаць тую дзеўчыну...

— Юльку? — пацікавіўся я.

— Яе! — ажывіўся Нупрэй.— Хачу паказаць нешта...

Ён палез у кішэню пінжака, нейкі час поркаўся там і нарэшце выцягнуў... птушку. Была яна мо крыху большая за ластаўку, з такімі ж доўгімі і вострымі крыламі, але не вельмі чорная. Кароткімі, учэпістымі пальцамі ног яна абхапіла Нупрэеў мезенец і затаілася на ім.

— Во дурніца! — не вытрымаў стары.— І глянуць на чалавека не хочаш! Ці сорамна за маці?..

— Няўжо зязюля? — аж не паверыў я.

— Яна самая!— ажыўлена адказаў Нупрэй.— Прысеў гэта я адпачыць, як чую: недзе над галавою пісклянята пішчаць. Глядзь туды — гняз-

дзечка вісіць. І, чую, непарадак у ім. Барукаюцца нібы... А потым гэная і ўпала на дол. Не разлічыла, ці што?..

Я ведаў, што ў такіх выпадках звычайна перамагае зязюля-падсусед, але сказаў:

— А можа, выгналі? У знак пратэсту...

Нупрэй не адказаў. Пракураным пазногцем стараўся прыўзняць птушынае вейка, але гэта яму не ўдавалася. Тым часам зязюльчына дачка перабралася з далоні на рукаў і пырснула там — пасадзіла белую плямку. Нібы сама здзівілася і расплюшчыла павекі. З-пад іх глянулі на нас шэрыя ягадзінкі вачэй.

— А прыгожыя вачаняткі маеш! — усміхнуўся Нупрэй.

Я сказаў:

— Яе ж Мікіта зжэрці можа...

Нупрэй зірнуў на мяне:

— А праўду, чалавеча, кажаш... Не падумаў я пра гэта...

Мы адышліся далей ад сцежкі і пасадзілі птушку на сасонку. Вольнаму — воля!

А я падумаў, што зязюльчыну дачку адпусціла б і Юлька...

ВУСАТЫ НЭСІ

Нават Арсен не ведаў, калі ён пасяліўся тут. Але калі пашматаў рыбакам невад, аб ім загаварылі, як аб нечым незвычайным і таямнічым. Той-сёй, казалі, бачыў: на захадзе сонца ён выходзіў з глыбінь і даваў сабе волю — каламуціў бліжні плёс, вохкаў і наводзіў жах на ўсё жывое. Іншы раз нават і сярод белага дня там рабілася ліха ведае што. То гусяня згіне, то недзе падзенецца цэлая чарада самых пародзістых, як тут гавораць, кітайскіх качанят...

— Яго работа! — скардзіліся вясковыя жанкі, маючы на ўвазе нешта сваё.— Гэта ўсё ён вытварае!..

Юлька ўсміхалася і, каб людзі чулі, жартаўліва казала:

— Нарэшце і мы дачакаліся свайго Нэсі!..

Пасля дзяўчынка нечага доўга шапталася з Нупрэем. Неўзабаве Юльчын бацька зрабіў у кузні спецыяльнай канструкцыі якар. Былі знойдзены доўгія-доўгія лейцы. І ў рэшце рэшт на вогнішчы засмажылі шэрую варону. Толькі пасля гэтага Нупрэй у суправаджэнні Юлькі пайшоў да возера, начапіў на якар прынаду і закінуў яе, як здавалася яму, у самае надзейнае месца.

Доўга чакаў стары, што атрымаецца з іх пры-

думкі. Але той «Нэсі» не падаваў аб сабе ніякага знаку. Усумніўся быў чалавек і пачаў ужо траціць усялякую надзею, як нечакана прыбегла Юлька і паведаміла:

— Дзеду! На ляйчыне торгаецца нехта!..

Вестка хутка абляцела вёску. Да возера пабеглі і малыя, і старыя — спяшаліся, каб не прараваронiць падзеі і ўласным вокам зірнуць на тое дзіва.

...Нупрэй паглядзеў на прысутных, папляваў на далоні і толькі тады ўхапіўся за ляйчыну. Пацягнуў на сябе і адчуў: на тым канцы захадзіла — цяжкое, непадатлівае, упартае. Здавалася, не ўпрыся нагамі ў пясок, як і ты апынешся там. Упрогся мацней і пачаў паволі адыходзіць ад вады. І тут ляйчына раптам абвісла, нібы парвалася, а на паверхню вады выскачыла вялізная, не раўнуючы, як бервяно, чорная пачвара. Нарабіўшы перапалоху, яна зноў знікла ў глыбіні. Падбеглі маладзейшыя, пачалі валтузіцца, дапамагаць Нупрэю і нарэшце вывалаклі тое «бервяно» на прыбярэжны пясок.

Чорная пачвара білася ля Нупрэевых ног, разяўляла шырозную вусатую пашчу і лыпала халоднымі вачыма — нібы здзіўлялася такой нечаканцы. Нупрэй выцер узмакрэлы твар і сказаў:

— Ну, браткі-бабы! Бярыце і нясіце... свайго... як яго... Нэсі, куды хочаце!.. І яшчэ падзякуйце вось ёй,— паказаў ён рукой на Юльку.

ЛІХТАРЫКІ

Аднойчы вечарам Нупрэй прынёс Юльцы светлячкоў. Юлька абрадавалася такому незвычайнаму падарунку, узяла шкляны слоік, паклала іх туды і доўга пазірала, як светлячкі там пераміргваліся.

Раніцай Юлька хацела яшчэ раз пахваліцца мне сваім багаццем, але калі дастала з-пад ложка слоік, у ім не было ніводнага светлячка.

— Мікіта паеў! — выказала меркаванне Юлька.— Няўжо Мікіта?..

Дзяўчынка хацела ўхапіць венік, адлупцаваць ката за такое нахабства, але і Мікіта, і венік недзе падзеліся. Яна ў роспачы села на канапу і ледзь не заплакала.

— Во дзівачка! — пачала ўшчуваць яе маці.— Нейкую казяўку шкадуе... А што з тых казявак?..

— Гэта не казяўкі, а ліхтарыкі! — не пагадзілася Юлька, пакрыўджана глянула на маці і выбегла з хаты.

Доўга не вярталася Юлька. І маці не трывожылася — такой бяды!

А калі вечарам з-за лесу нечакана выплыла чорная хмара і павісла над самай вёскай, занепакоілася:

— Навальніца ідзе, а дзеўчына гойсае недзе...

4 Зак. 378

Не было Юлькі і тады, калі над выганам бліснула маланка і ўдарыў пярун. Не з'явілася дзяўчынка, калі з неба лінула як з вядра і зрабілася зусім цёмна.

Цемру ўсё часцей і часцей разрывала бліскавіца, хата ажно ўздрыгвала ад грымот, а Юлькі ўсё не было.

— Ну і дзеўчына! — злавалася маці.— Я ёй пагойсаю! Няхай толькі прыйдзе!..

А калі Юлька нарэшце з'явілася, маці толькі пляснула ў далоні:

— А дачушка мая! Ты ж уся макрутка!..

А тая стаяла пасярод хаты і ўсміхалася.

На мокрай Юльчынай далоні варушыліся тры маленькія светлячкі.

Тры жывыя ліхтарыкі...

ЯК ПОМСЦІЛІ ПЧОЛЫ

Абора, акрамя ракаў, дужа любіў яшчэ і салодкае. Але завесці сабе калоду-другую пчол ленаваўся — болей гойсаў па лесе і прынюхваўся: а ці няма дзе дупла з вашчынаю? Часцяком яму надаралася знайсці тое дупло, і тады ўжо мог чалавек вісець на дрэве хоць да вечара, абы накалупаць, хоць крышачку, таго мёду. Потым хадзіў па вёсцы і выхваляўся:

— Учора пашчасціла дык пашчасціла! Цабэрак вашчыны навыдзіраў! Наеўся — ажно пот на жываце выступіў...

Юльчына маці слухала Абораву пахвальбу і смяялася:

— А мы гледзімо: чаму гэта ля цябе мухі ўвіхаюцца? А яно вунь што!..

Абора гыгыкаў ад задавальнення і прасіў кубак бярозавіку — запіць учарашні ласунак.

...І на гэты раз Абора падаўся ў лес. Апынуўся ў верасовых зарасніках і пачаў прыглядацца: дзе б убачыць дзікую пчалу? А ўбачыў — упаў перад ёю на калені і пачаў поўзаць па зямлі, пакуль не цыркнуў слінаю на пчаліныя крыльцы.

Аццяжэлая пчала паспрабавала спачатку страпянуцца, пазбавіцца непатрэбнага грузу, але по-

тым кінулася дадому — каб выручалі сяброўкі. Абора — за ёю. Ляцеў навыперадкі, пакуль не зачапіўся за корч. Тады зноў пачаў поўзаць па верасе, зноў шукаў дзікую пчалу і зноў цыркаў на яе слінаю.

Нарэшце знойдзена і тое дрэва, у дупле якога атабарылася пчаліная сям'я...

Але Абору не пашанцавала. Яго прывезлі дадому ў матацыклетнай калясцы — абдзёртага і запухлага, з вывіхнутай рукою і парожнім цабэркам.

— Знайшоў пад дубам,— растлумачыў Арсен Аборавай жонцы.— Ледзь клёваў...

Нешта з тыдзень не выходзіў з хаты Абора. А калі жонка павыкалупвала з барады пчол і адмачыла мужа кіслым малаком, а сусед-ветэрынар управіў на месца руку, нарэшце паказаўся на людзі і пачаў апраўдвацца:

— Дужа злосныя пайшлі цяперака пшчолы!.. Так ужо джгалі, так джгалі, што і не памятаю, як на доле апынуўся...

Юлька слухала Аборавы тлумачэнні і радавалася за тых пчол.

АГОНЬ

Выпадкова нехта выпусціў яго на волю.

Ціхі і рахманы да гэтага, ён адразу ж змяніўся. Дзе ўзяліся спрыт і лёгкасць! Стрымгалоў бег па зямлі, прыпадаў да басаногіх бярозак, блытаўся ў густой чупрыне багунцу, ускакваў на верхавінкі малалетак-сасонак і зноўку імчаў далей.

Нарэшце, спатыкаючыся на купінах, дапяў ажно да ручая. Мераўся чырвоным матылём пераляцець на той бок, у сасновы бор, але я стаў на яго шляху.

І ён памёр пад маімі нагамі.

ДА ФІЛЬКІ Ў ГОСЦІ

Каб трапіць у Чорны лес, дзе, як сцвярджала Юлька, жыве яе Філька, трэба спачатку сцяжынкаю выбрацца на лясную дарогу, што вядзе ажно да Жукава поля, павярнуць направа, мінуць масток і хвілін дзесяць пратэпаць не так ужо ўбітым шляхам. Але, нягледзячы на гэта, Юлька выдатна арыентавалася.

— А я тут, як у гародчыку! — пахвалілася яна.— Ніколечкі не зблукаю!..

Сонца ўжо адыходзіла на спачын, і толькі макаўкі дрэў купаліся ў яго апошніх промнях. У Чорным лесе было волка. Пакуль збіралі сучча і раскладалі агонь, сонца зусім села — нават на самым высокім дубе не відаць было ні промня. Прыцемкі таксама доўга не трымаліся. Яны паблукалі над дрэвамі колькі хвілін і пачалі саступаць месца цемры. Вось яна ўжо канчаткова апусцілася на дол, спавіла спачатку кусты, потым і дрэвы і нібы затаілася, нібы прыслухоўвалася да нечага.

А ля нашага невялічкага вогнішча бруіла жыццё. Спачатку з'явіліся тры ці чатыры начніцы і замітусіліся ў дрыготкім святле. Потым аднекуль прыляцеў іх цэлы рой — белых, жоўтых, карычняватых — і пачаў над агнём свой казачны

танец. Наўкол стаяла такая цішыня, што здавалася, у паветры чуцён быў шоргат іх крыльцаў.

Юлька сядзіць побач.

— І дзе ж той Філька падзеўся? Няўжо не акажацца?..

Я паглядаю на Юльку і нечакана пытаюся:

— А мо ўвогуле няма твайго Фількі? Мо ты прыдумала яго?

— Не,— адказвае Юлька.— Я сама летась яго сюды прынесла. Дастала з клеткі, што ў школьным жывым кутку вісела... Настаўніца на мяне потым сварылася дужа... А калі нядаўна з таткам ішлі з сенкавання, Філька разы са два гукнуў мне...

Нечакана ў лістоце суседняга дрэва нехта залапатаў крыламі, і пачулася глухаватае, але даволі пагрозлівае:

— Ух-гу!..

Юлька кранула мяне за рукаў і прашаптала:

— Філька прачнуўся...

Якраз у гэтую хвіліну ад балота даляцелі да нас яшчэ нейкія незразумелыя гукі:

— Буль-буль-буль! Буль-бу-у!..

Юлька зноў кранула мяне за рукаў:

— Бык вадзяны... Ён заўсёды дражніцца з Фількам. Стаіць па калені ў вадзе і дражніцца... А Філька яго ой як не любіць!..

І сапраўды. Толькі перастала булькатаць, як зноў азваўся Філька:

— Ух-гу! Ух-гу!..

А вадзяны бык сваё:

— Буль-буль-бу!

— Нібы дзюбу палошча,— засмяялася Юлька.— Прапалошча і бульбы папросіць... Прапалошча — і зноў папросіць... Але ён так сабе — дражніцца!..

— Ух-гу! — нібы пацвердзіў Юльчыны словы Філька.

Раптам нехта зарагатаў:

— О-хо-хо!..

Рэха падхапіла гэты рогат і пакаціла з верхавіны на верхавіну — ажно туды, за Дзікае балота, дзе, як Юлька пераконвала мяне, і жыў той вадзяны бык.

— Лесавік! — насцярожылася Юлька.— Але ты не бойся! Ён — добры. Ён толькі палохае. Гэта п'янага Абору ён аднойчы павадзіў ажно да раніцы... Абора казаў, што рука ў яго халодная-халодная і барада вялізная...

Юлька ўвайшла ў сваю ролю канчаткова. І мне не хацелася перашкаджаць ёй. Толькі, успомніўшы першы дзень нашага знаёмства, запытаўся:

— Скажы, Юлька, а ці бачыла ты ўсё ж тую русалку?

— Бачыла,— зусім сур'ёзна адказала Юлька.— Яна ў той вечар ля вірка стаяла... І грабянцом белым расчэсвала косы...

ЧЫЛІМ

Пайсці па чылім мяне яшчэ звечара падбіла Юлька.

— Я ведаю, дзе ён водзіцца,— гаварыла яна.— Летась бачыла, як хлопцы латошылі...

Мы ідзём халаднаватым з ночы поплавам. З-пад ног тады-сяды нехаця пстрыкаюць конікі. Ды Юлька на іх нават не звяртае ўвагі, крочыць наперадзе і разважае:

— Во каб чылімам засеяць якую завадзь!.. Усё лета можна было б ласавацца...

Пра тое, што чылім — вадзяны арэх — сустракаецца ў гэтых мясцінах, я чуў даўно, але натрапіць на яго ніяк не надаралася. А тут — на табе! — Юлька вядзе паказваць. Ды і бацька яе загарэўся жаданнем і вырашыў аблазіць з намі хоць усе затокі, а даведацца, што з ім ды як, з тым чылімам.

Ля Крывой затокі Юлька спыняецца і кажа:

— Вось тут яны яго латошылі...

Першая палезла ў ваду Юлька, а за ёю і мы. Але як ні стараліся, як ні боўталіся ў той затоцы, а не маглі адшукаць ні сцяблінкі. Аблазілі і суседнія затокі, ды тых рагачыкаў, як казала Юлька, так і не сустрэлі нідзе.

— І куды ты падзеўся, чылім?! — нібы клі-

кала, нібы сама ў сябе пыталася Юлька.— А можа, качкі яго паелі? Яны жываты ім лечаць...

— Слухай ты яе! — вылазячы з вады, сярдзіта прамовіў Юльчын бацька.— Праўда, пра той чылім Нупрэй мне расказваў некалі... Але калі тое было! Звёўся чылім. А яна — жываты лечаць!..

Юлька бянтэжыцца ад бацькавых слоў і змаўкае.

Пакуль мы ляжалі на грудку і абсыхалі, Юлька сядзела крыху воддаль, на купіне, нейкая паніклая і прысаромленая...

...Надвячоркам, калі мы з Юльчыным бацькам вялі на прызбе нетаропкую гамонку пра яго кавальскія справы, аднекуль прыбегла Юлька і яшчэ ў веснічках крыкнула:

— А ты няпраўду казаў! Чылім не згінуў! Вось ён!..

І Юлька паклала на бацькаву далонь некалькі рагатых касцяшак.

Я здагадаўся пра ўсё і сказаў:

— Усё ж адгукнуўся чылім?

— Адгукнуўся! — горда прамовіла Юлька.— Я засею ім нашу затоку! Пабачыш, засею!..

ГАРМОНІЯ

Была якраз тая амаль няўлоўная хвіліна ў вечным зямным кругавароце, калі адразу цяжка і зразумець: дзень гэта яшчэ ці ўжо вечар.

На верхавіне нашай бярозы чырванню гарэла сонца, а ўнізе, крыху воддаль яе, у густым зарасніку лазы, прывідам снавалі лёгкія прыцемкі. Недзе там, высока ў небе, трапятала, звінела песня жаваранка. І ўсё гэта нібы некуды плыло ў такой вялікай суладнасці, што здавалася, зрабі крок — і парушыцца адно з тых звенняў, а свет рассыплецца, ператворыцца ў суцэльны хаос. І тады будзе ні сабраць, ні зноў настроіць яго на зямны лад...

Юлька сядзела і, нейкая ўзрушаная, баялася нават паварушыцца. А я глядзеў на яе і думаў: ці нашы нашчадкі супыняцца некалі тут? Ці здольны яны будуць бачыць і чуць тое, што бачым і чуем мы?

Калі так, то мы будзем жыць і тады.

ЭКСПЕДЫЦЫЯ НА ЗУБРОВУЮ ПАЛЯНУ

— Дзед! — адважыўся я аднойчы.— Не шэнціць мне. Каторы дзень зубровую траву шукаю, а знайсці не магу...

Нупрэй сядзіць на прызбе, глядзіць на макаўкі сосен, што зусім блізка падступілі да яго сялібы, і быццам не чуе маіх слоў. Потым нехаця, нібы між іншым, гаворыць:

— А ў Арсена пытаўся?

— Пытаўся,— кажу.— Але хіба яго адарвеш ад вады?

— Не адарвеш,— пагаджаецца дзед.— А чаму Юльчын бацька не пакажа?

— Дык ён жа дзень пры дні ў кузні,— за мяне адказвае Юлька.

— Праўда,— зноў пагаджаецца дзед і зноў, нібы між іншым, спакойна дадае: — А ў Аборыхі пытаўся?

— Не,— кажу.— Не пытаўся.

— І не трэба! — раптам махае рукой Нупрэй.— Да Аборыхі з горада ўнучаняты папрыязджалі. То яна, як тая кураводка з пылянятамі, усё на падворку топчацца...

Пачынаю траціць надзею. Бо разумею, што Нупрэю ў такіх гадах не да лясных пагулянак. Але раптам чую:

— А пайду-тко з вамі! Як піць даць экспедыцыю тую правядзём!..

Сказаў гэтак, а падняцца не падняўся. Сядзіць на прызбе і толькі пазірае на нас. Нібы наўмысна адцягвае, нібы раздумвае: адпраўляцца ці не адпраўляцца ў лясныя нетры. Потым нечакана тлумачыць:

— Хто шчаслівы на руку ды чысты на сэрца, назбіраць можа травіцы той цэлы снапок... Толькі на ліха снапок! Жменьку заткні за бэльку — усю зіму будзе духмяніць хата...

Слухаю і не перабіваю — баюся: а раптам ён раздумае? Але, відаць, Нупрэй правільна зразумеў наш намер і таму ўжо, здаецца, нічога не трымае ў сакрэце:

— Нам на неруш патрапіць трэба. На нерушы яна толькі і водзіцца...

Мне ўжо рупіць падбадзёрыць, што калі ён не палянуецца, то і на тую неруш патрапім, і тую жменьку травы набяром. Але мацней закілзваю сваё жаданне і не падганяю. А дзед ужо зусім разышоўся.

— Ого, зубровая травіца! — ледзь не ўскрыквае ён.— Вялікую сілу мае травіца наша!..— Нахіляецца да Юлькі і па-змоўніцку ціха гаворыць ёй: — А падкінь на падворак якое каліўца — чалавек ураз падабрэе... І напасці розныя яна ад хаты адганяе...— Зірнуў на мяне, усміхнуўся і прапанаваў: — А давай-тко лепей на Зубровую паляну патэпаем!..

Падняўся і пайшоў з падворка.

...Ішлі моўчкі і доўга. Перасеклі спачатку адзін квартал, другі, потым утапіліся ў гушчэчы маладога сасонніку, і, калі выбраліся на яшчэ некалі ўбітую калёсамі лясную дарогу і стала лягчэй дыхаць, Нупрэй загаварыў зноў:

— А зубровую траву не кожны і адшукае! Калі натрапіш на тую неруш, дзе і бярозка расце, і дубок, і сасонка, стань-тко наўпроць ветру і нюхні. Як яна паблізу — пачуеш! А не пачуеш — хадзі, углядайся. Толькі воку не давярай. Вазьміся лепей за травіну і прапусці між пальцаў. Будуць пальцы нібы мукою прыпудраны — значыць, яна. Не будуць — не яна. І яшчэ ў яе карэньчыкі вішнёвага колеру...

На лысым пагорку, парослым калючым сіўцом, Нупрэй нечакана спыніўся, перавёў дух і потым склаў далоні рупарам:

— Ого-го-го!..

— Го-го-го! — молада адказала рэха і пакацілася недзе туды, ажно пад Жукава поле.

— Во як! — усміхнуўся аднымі вачыма Нупрэй, нейкі момант паглядаў туды, дзе згубілася рэха, і ўдакладніў: — Ісцімем ужо нядоўга.

Яшчэ дзесяць мінут хады, і мы спыніліся на палянцы.

— Зубровая ці не Зубровая? — сам у сябе пытаецца Нупрэй і вырашае: — Зубровая! — Ён нюхае гарачае паветра, ад задавальнення ажно жмурыцца і загадвае Юльцы: — А нюхні-тко ты!

Юлька нюхнула. І раз, і два. Але ў густым лясным водары адчуць пах зуброўкі не змагла. Азірнулася, заўважыла непадалёку зялёную купіну высакаватай травы і кінулася туды, але Нупрэй папярэдзіў:

— Гэта, унучка, трын-трава. Пакінь яе!..

Я не веру і правяраю травіну. Сапраўды, ні тае пудры на пальцах, ні тых вішнёвых карэньчыкаў. А Нупрэй раіць:

— Правер-тко вунь тую!

Ідзём з Юлькай пад бярозку, што стала побач з сасонкай, і не верым вачам. На пальцах — ледзь прыкметны белы налёт, а ніжняя частка травіны нібы вішнёвым сокам пафарбавана... І пах. Непаўторны! Параўноўваем гэтую купіну травы з першай. Тая трын-трава амаль нічым не адрозніваецца ад зубровай! І здзіўляемся, адкрыта зайздросцім дзедаваму ўмельству...

А Нупрэй стаіць пасярод Зубровай паляны і задаволена ўсміхаецца.

ВЫПАДАК НА БЕРАЗЕ

Прыбой адступіў, а рыбінка засталася на беразе. Збянтэжаная такой несправядлівасцю, глытала даўкае паветра, а потым страпянулася і асыпала на пясок серабрыстую луску. Відно было: у яе спалоханых вачах вось-вось дагарыць летні дзень.

Раптам Юлька ўкленчыла на пясок, працягнула да яе рукі і асцярожна, каб не садраць лускі, панесла да вады.

Калі рыбінка згубілася ў азёрным блакіце, Юлька ўсміхнулася — шчыра і добразычліва.

ДАМОК-ЦЕРАМОК

Ён — на тым беразе возера, пад разгалістым дубам... Але адсюль яго цяжка ўбачыць. Толькі калі выйдзеш на прычал і паўзіраешся хвіліну-другую, можна заўважыць зялёную пабудову, крыху святлейшую за кустоўе ляшчыны.

Юлька стаіць ля завадзі і думае: ісці сухапутам ці на лодцы дабірацца да таго дамка-церамка? Але бідон з малаком важкі, ледзь падняць, і Юлька садзіцца ў лодку. Я адчуваю, што Юльцы будзе нялёгка справіцца з вёсламі, і прапаную:

— Перавезці?

— Перавязі! — адказвае Юлька і раіць: — Пакуль я аддам малако, ты парыбаліць у затоцы зможаш...

Ад вады падымаецца лёгкі туман і нібы растае ў ранішніх праменнях. Час ад часу трапляюцца на нашым шляху лілеі, і Юлька, перагнуўшыся цераз борт пласкадонкі, зрывае кветкі. Раптам яна гаворыць:

— Каб муж яе не інвалід быў, зроду б ёй малако не вазіла...

Я ведаю, каму — «ёй», і таму не перапытваю. «Яна» — гэта Пампушка. Усяго які тыдзень, як прыехала сюды, пасялілася ў тым зялёным церамку, а ўжо ўсяму Астраўку паспела надакучыць.

З'явіцца іншы раз у вёсцы, дык не ідзе па вуліцы — плыве. І на людзей не паглядае. Нібы вакол адны маляўкі...

— Фу! — незадаволена моршчыцца Юлька.— Тата ўчора сказаў: мятлой гнаў бы такіх... Толькі баб нашых, кажа, нервуе... А яшчэ ён сказаў, што яна — фіфа. А што такое «фіфа», га?..

Лодка дніішчам шарганула аб пакаты пясчаны бераг. Якраз у гэтую хвіліну ля бліжняга куста арэшніку загарлапаніў транзістар — нібы хто парэзаў нажоўкаю бляху. Юлька неяк сцялася, паглядзела туды, адкуль далятала віскатня, і сказала:

— Яна!

Сапраўды, у засені куста, на чырвонай коўдры, у купальніку раскашавалася Пампушка. Яна не паднялася, не падышла да Юлькі, каб забраць бідон, а, перасільваючы транзістар, крыкнула:

— Дзе-вач-ка! Пашукай Сямёна Сямёнавіча! Ён прыме малако!..

І Юлька пайшла.

А я не паплыў у затоку. Вырашыў пачакаць Юльку.

Каб хутчэй перавезці яе на свой бераг...

ПАМПУШКА

Канікулы падыходзілі к канцу, а ў Юлькі не было яшчэ нейкага падручніка. Таму яна вырашыла паехаць у Залессе, у кніжны магазін.

Не па-жніўеньску гарачы выдаўся дзень. Юлька стаіць на прыпынку і чакае аўтобус. Побач Пампушка ледзь не млее.

— Якая спёка!— Яна нервова азіраецца і раптам ускрыквае: — А божа ж мой! У кажусе!..

Сапраўды, у жоўтым кажушку да прыпынку тупае Нупрэй. Не спяшаецца, ідзе павольна. І не адзін. З правага боку дробненька перабірае нагамі каза. Дзед вітаецца з Юлькай, а пытаецца чамусьці ў Пампушкі:

— У Залессе?

— І ў Залессе! — кідае адчэпнага Пампушка і адварочваецца: — Сасмажыцца можна, а ён і аблавушку яшчэ насунуў...

Дзед крыўдуе на такое абыходжанне, адыходзіць і прымошчваецца ў цяньку пад ліпай.

Нарэшце падышоў аўтобус, і Пампушка запрацавала локцямі, першая ўбілася ў салон. Машына ўжо хацела зрушыць з месца, як у пярэдніія дзверы пастукаў кіёк.

— Хіба не бачыш? — пачуўся прыглушаны Нупрэеў голас.



Дзверы адчыніліся, па прыступках борздзенька затупала каза. Нупрэй — следам. Агледзеў пасажыраў і пачаў расшпіляць кажушок. Дастаў скураны капшук, з яго — складзеную ў некалькі столак рублёўку. І тут — зноў Пампушка.

— У нас не кураць!

— Баронь божа! Я... гэныя самыя... квіткі купіць...— Нупрэй падаў Пампушцы рублёўку і папрасіў: — Перадай, дачушка! На дваіх.

— Я вам не дачушка! — сярдзіта агрызнулася тая, але рублёўку перадала.

Сядзела яна ўжо, як на кастрыцы:

— І адкуль такія?

— Тутэйшыя мы, тутэйшыя! — адказаў Нупрэй.— Ганначка нас парадавала... Дачушка ў яе... Так што да праўнучкі едзем!..

— І гэта? — зноў закруцілася Пампушка і паказала на незвычайную пасажырку: — За гэта...

— А ты не гэткай! — пачаў ужо злавацца Нупрэй.— Ягад не рассыпле! Прывычная!

Ад смеху аўтобус ажно затросся. Усе глядзелі цяпер толькі на Пампушку. А тая кіпела:

— Спыні машыну, вадзіцель!..

З дынаміка — спакойны, смяшлівы голас:

— Грамадзяначка, толькі на прыпынках!..

Аўтобус нарэшце спыніўся, і Пампушку нібы хто кальнуў шылам: усхапілася і — да дзвярэй. За ёю паважна выйшаў Нупрэй. З казою.

Юлька яшчэ доўга смяялася.

ЛЯСНЫЯ МАНАХІ

Гавораць, некалі яны таксама жылі побач з людзьмі — майстравалі сваё жытло на страсе хаты або хлява і кожную раніцу вясёлым клёкатам будзілі вясковых пастушкоў. Радаваліся такому суседству і дзеці, і старыя... І людзі кожную вясну сустракалі іх з далёкага выраю, як самых дарагіх і блізкіх.

Але, кажуць, у вёсцы аднойчы пасяліўся злы, нядобры чалавек. Яму было ўсё не так, усё не гэтак. Не мог цярпець ён і буслінага клёкату. Каб пазбавіцца яго, палез на хату і разбурыў гняздо.

Доўга кружылі ў той дзень птушкі над непрыветнай хатай. Потым паляцелі ў лясныя нетры, дзе не было ні вёсак, ні людзей, і прымасціліся на высозным дубе. Калі ўзышло сонца, птушак было не пазнаць. Ад крыўды і несправядлівасці яны ажно счарнелі...

Потым на тым дубе яны пабудавалі сабе новае жытло.

А потым з'явіліся і бусляняты. Надзвычай даверлівыя. І бялюткія... Але калі падраслі і даведаліся ад бацькоў пра тую вялікую крыўду — таксама апранулі жалобнае адзенне...

Так і паляцелі яны, чорныя, у далёкі вырай.

А вясною вярнуліся.

Толькі не ў вёску, а ў пушчу...

І хоць таго нядобрага чалавека даўно няма, птушкі ніяк не могуць забыцца пра сваю крыўду і кожны год стараной аблятаюць людскія паселішчы...

Праўда, іншы раз чорны бусел надвячоркам прылятае да возера, заходзіць у цёплую ваду па калені і нібы з тугою пазірае на стрэхі хат.

У такія хвіліны Юлька ідзе на поплаў, садзіцца ў траву і доўга глядзіць на чорнага бусла — ляснога манаха. Пакуль той не падымецца на крыло і не возьме кірунак туды, у лясную глухмень — далей ад людскога вока. Тады Юлька вяртаецца дадому, дастае з-за бэлькі запаветную траву зуброўку і, памятаючы Нупрэеву параду, крадком разносіць па тутэйшых сялібах.

...Каб такога болей не паўтарылася тут.

АСІЛКІ

Пабачыць іх, пазайздросціць іхняму паважнаму ўзросту і сіле прыходзяць сюды ўсе прыезджыя. А яны стаяць, горда аглядаючы наваколле. Як вартавыя.

Іншы асілак не вытрымае цяжару гадоў. І тут жа на яго месца становіцца другі — малады — з такім жа нялёгкім, але пачэсным будучым.

Нупрэй не праміне тады прытэпаць, доўга цмокае, аглядаючы дубок, і, як жывому, кажа:

— Расці, браток, расці...

Аднойчы ён доўга вадзіў мяне па тых мясцінах, хваліўся то адным асілкам, то другім, а потым прывёў на касагор і з роздумам прамовіў:

— А паўзірайся ты на яе!..

Там, на касагоры, некалі стаяў дуб. Але аднойчы наляцела бура, і дрэва не вытрымала націску.

А потым на яго месцы вырасла бярозка.

Я пазіраў, як весела шамацела зялёным лісцем бярозка, і чамусьці ўспомніў і пра салдата Жукава, і пра Юльку.

ЖЫВАЯ ВАДА

Юлька прыбегла са школы, кінула на ўслон брызентавы партфелік і сказала:

— Дзед Нупрэй занядужаў. Ляжыць на лаве і не варушыцца...

А потым наблізілася да мяне і прашаптала:

— Пакляніся, што нікому не скажаш...

Я не разумеў, у чым справа, але ўжо здагадваўся, што Юлька зноў прыдумала нешта, і таму сказаў таксама шэптам:

— Клянуся...

Тады Юлька прамовіла:

— Ідзі да пачакалаўкі. Хутка і я прыбягу...

Вымушаны быў паслухацца. Ля аўтобуснага прыпынку сеў на лавачку і пачаў чакаць.

Праз хвілін дзесяць з-за павароткі, зусім нечакана, вынырнула спачатку Альма, а за ёю і Юлька. Юлька сказала:

— Траім весялей будзе!..

Што задумала Юлька? Куды яна выбралася? І навошта ўзяла з сабой Альму? Задаваў я сабе гэтыя пытанні, але адказу не знаходзіў.

Неўзабаве Юлька павяла мяне ў лес. Калі спусціліся ў яр, дзе стаялі рэдкія венікі ядлоўцу, Альма спынілася першая і, азіраючыся на Юльку, замахала хвастом.

Толькі цяпер заўважыў я на дне яра празрыстую стужачку. Яна выбягала з-пад вялікага, парослага мохам каменя і ўцякала некуды ў кустоўе. Юлька тым часам дастала з-за пазухі бутэлечку, легла на камень і падставіла пад струменьчык сваю пасудзіну. Калі бутэлька напоўнілася, нацадзіла яшчэ — ажно цэлыя прыгаршчы — вады і загадала:

— Паспытай!

Вада была сцюдзёная і аддавала нечым непаўторным...

— Нупрэй пап'е — адразу ачуняе! — раптам сказала Юлька і паднялася з каменя...

Праз дзён чатыры ці пяць, надвячоркам, адчыніліся дзверы хаты, і на парозе ўбачылі мы Нупрэя. На твары яго былі яшчэ сляды нядаўняй хваробы, але трымаўся дзед бадзёра, нават зухавата. Падаў усім па чарзе руку, сеў на ўслон і сказаў:

— А ведаеце, што пасобіла мне адбрыкнуцца ад тае хваробы? Жывая вада! Адзін чалавек прынёс мне тае вады і наказаў, каб тройчы на дзень па тры глыткі піў. Дык я тыя таблеткі толькі жывой вадой і запіваў...

Нупрэй па-змоўніцку паглядзеў на Юльку.

А Юлька нібы і не чула Нупрэевых слоў. Сядзела на ўслончыку і рабіла выгляд, нібы яе гэта зусім і не датычыць...

ВЕРАСНЁЎСКАЙ НОЧЧУ

Вераснёўская ноч апускаецца на зямлю неяк нечакана. Нядаўна нібы шарая гадзіна была, а цяпер — хоць выкалі вока.

У такія хвіліны здаецца, што ўсё жывое нібы заснула. Але раптам па-начальніцку рохкне ў лагчыне стары сякач. І тады чорны табун пасунецца за ім. Ажно туды, ва ўрочышча Дубы. Ды на шляху нечакана напорацца на соткі і пачне паспешліва дратаваць бульбу, пакуль з хаты не выскачыць гаспадар і не забразгае ў пустое вядро...

А ласю ў гэты час не да ласункаў. Ён ходзіць і ходзіць па лесе, дзярэ капытамі дол і трубіць — працяжна, пагрозліва, зазыўна... Ажно заяц становіцца пяньком і, натапырыўшы вушы, слухае той кліч. Нават вожык, учуўшы лася, нейкі час не шорхае апалай лістотай. І толькі начны разбойнік — філін — будзе адкрыта здзіўляцца ласінаму клопату:

— Ух, ты! Ух, ты! Ух, ты!..

А бабёр на беразе возера толькі што спляжыў асіну, сячэ яе на кавалкі і тралюе бярвенні — ажно плёскат ідзе — у свае надзейныя схованкі...

Іншы раз прывалачэцца з Белавежы лясны цар і будзе правяраць, як на палянах раслося-былося яго ўласнай траве — зуброўцы...

І так праз усю доўгую, волкую ноч.

ЗВЫЧАЙ

Чаго толькі не расце ў Астраўку! Кучаравыя клёны і танклявыя бярозкі, тугадумы-дубы і трапяткія асінкі, разважлівыя елкі і сарамлівыя рабіны... І памнажаюць людзі іх неяк па-свойму —паэтычна.

Асабліва прыкметна гэта, калі выпадзе ўрадлівы год на дзятву. То той, то другі падаецца ў бліжні гай і прыносіць на сваю сялібу маладое дрэўца. Мужчыны гэта робяць сур'ёзна, як належнае.

І ніхто не парушае даўняга звычаю.

ДЗЕНЬ БАБІНАГА ЛЕТА

Восенню дзень прыходзіць у Астравок не так, як улетку. Улетку яго нараджэнне пачынаецца ледзь не апоўначы. Спачатку неба над лесам пасвятлее, а потым пакрыецца жаўтаватай паваллокай, а пасля ўжо і зусім разрумяніцца — молада, паспешна. Не заўважыш нават, як з таго полымя выплыве такое ж чырвонае сонца і пакоціцца ўгору, увачавідкі святлеючы і сыходзячы зыркімі промнямі. І ўвесь гэты час за акном у гародчыку будуць нецярпліва пасвістваць шпакі. А потым, радыя, кінуцца на лугавіну ганяцца за конікамі...

Але гэта яшчэ не ўсё. Дзень пакрочыць па зямлі сапраўдным уладаром, калі вёску абудзіць буслiны клёкат. Перш і не зразумееш нават: Нупрэевы птушкі гэта ўзнялі траскатню ці які трактарыст запускае на калгасным двары матор свайго трактара... Тады толькі вясковай вуліцай, падымаючы зляжалы пыл, пройдзе статак кароў, прабяжыць грузавік і з комінаў пачнуць падымацца першыя дымкі...

Восенню не так. Асабліва ў кастрычніку неба на ўсходзе рэдка калі напамінае пра нараджэнне новага дня. Яно неяк аднолькава святлее — і там, і тут. І амаль заўсёды зацягнута шэранню. Чакаеш сонца над ельнікам, а яно раптам разарве тую

шэрань аблокаў і павісне вунь ажно дзе! Менавіта ў гэты час заўважаеш, як паблісквае інеем апалае лісце. Ноччу ў вёску забягаў першы прымаразак і пакрыў інеем усё чыста. Нават пляскаты камень, што прымасціўся ля студні, і той серабрыцца ў скупаватых сонечных промнях...

Нарэшце камень, трава, ганак, паркан і нават пажухлае лісце ў гародчыку — усё пакрываецца буйнымі, дрыготкімі кроплямі. Гэта сваю справу зрабіла сонца і цяпер, задаволенае, купаецца ў кожнай расінцы...

Тым часам нябачныя павучкі-сувязісты расцягнуць над вёскай белыя правады-павуцінкі. Быццам спяшаюцца паведаміць людзям, што нарадзіўся новы дзень, што вёску яшчэ не пакінула бабіна лета...

ЧАС КАПУСТЫ

Калі надыходзіць час капусты, у вёсцы пануе незвычайнае ажыўленне. Усё, здаецца, прыходзіць у рух. З гародаў звозяцца і зносяцца ў сенцы і пад павеці хрумсткія качаны і тут жа сартуюцца.

Тыя, што з кулак, пакладуць на самы спод кадушкі, з імі паводзяць сябе асцярожна, нават далікатна. Вялікія галовы можна перакідаць з месца на месца і не баяцца — яны ўсё роўна будуць крышыцца, а тое крышыва пераціравацца рукамі і таўкачамі. Таму з імі нават жанкі абыходзяцца даволі вольна, нібыта і не цэняць тое дабро, нібыта яно не іхнімі рукамі вырашчана.

Не паспее суняцца першая хваля ажыўлення, як дзесьці на канцы вёскі народзіцца другая — больш мітуслівая і неспакойная. Бо раптам выяўляецца, што забыліся пра эстэтычны бок справы. Ёсць морква, дык чамусьці няма адпаведнага гатунку яблыкаў. Ёсць тое і другое, дык недзе падзеліся кроп з брусніцай.

А якая гаспадыня пагодзіцца з тым, каб у яе капусту не была ўкроплена ярка-чырвоная ягадзіна ці іншая прыправа? І зноў — бегатня, гамонка, роспыты...

Нарэшце ўсе, здаецца, угаманіліся. Ужо ля



платоў даўно павысыхалі вымытыя да васковай жаўцізны кадушкі, а распачынаць тое шаткаванне вёска чамусьці не асмельваецца. Не было ж сігналу! Той сігнал павінна падаць Аборыха — адзіны чалавек, які па толькі ён адной вядомых прыкметах вызначае час, калі без рызыкі і боязі за якасць будучай квашаніны можна брацца за працу.

— Пара, дзеванькі! — з'яўляецца нечакана, звычайна вечарам, і вестка маланкаю аблятае хаты.

Назаўтра ўжо новая хваля разносіцца па вёсцы. На гэты раз бегатню ўсчынаюць мужчыны — адпрошваюцца [redacted] работы дахаты, каб, крый бог, не згубіць свайго аўтарытэту ў гэтай складанай сітуацыі. Але праз якую гадзіну яны пачынаюць каяцца ў сваёй паспешлівасці. Варта гаспадару пераступіць парог, як ён адразу разумее: уладу паспела прыбраць да рук жонка. Яна і начальнік табе, і камандзір...

Адзін за адным сыплюцца хутка загады-распараджэнні:

— Мый рукі! Апранай чыстую кашулю! Падвяжы фартух!..

І мые, і апранае, і падвязвае.

А потым становіцца да балеі і ўпрагаецца ў шаткаўніцу.

Вось і Юльчына маці ачышчае ад ліста-зялянца качаны, разразае на чатыры часткі і грувасціць беласнежныя брускі на стол. Цэлая гара

5 Зак. 378

брускоў! Яны нават і парыпваюць так, як першы сняжок — хрумсь-хрумсь!..

Застаецца толькі складаць тыя брускі ў скрыначку шаткаўніцы і шморгаць ёю сюды-туды.

Шах, шах, шах!

Цяпер можна крыху размяцца. Пакуль укрыецца днішча кадушкі маленькімі качанамі, пакуль выграбаецца [illegible] балеі шаткованка, час ідзе весялей. А потым зноў тое самае: шах, шах, шах!..

І так ледзь не да поўначы, пакуль не пачуецца выратавальная каманда:

— Досыць! Кадушка паўнюткая!..

БАЗАРНЫМ ДНЁМ

Аднойчы ў выхадны дзень Юлька ўвязалася за мной — паехаць у горад. Спачатку я адгаворваў яе ад такой задумы. Маўляў, будзе яна блізкі свет цягнуцца! І дзеля чаго? Але Юлька была няўмольная.

У райцэнтр прыехалі яшчэ да абеду. Пакуль я вырашаў свае справы, Юлька абабегла амаль усе кіёскі і накупляла цэлую калекцыю каляровых паштовак.

— Хутка свята Кастрычніка,— узрадавана гаварыла яна.— Павіншую ўсіх сваіх і настаўнікаў, і сяброўак.

Каб скаратаць час, што заставаўся да адыходу нашага аўтобуса, мы вырашылі схадзіць на базар і крыху патаўчыся сярод людзей. Ступілі за вароты і ажно здзівіліся: колькі тут грузавікоў, вясковага і гарадскога люду! І калі яны паспелі паз'язджацца-пасыходзіцца сюды?

Па левую руку, як акінуць вокам, радамі і ўперамешку стаялі каляровыя вазы і зялёныя грузавікі. У драбінах тых вазоў на саламяных подсцілках ажно стагналі ад нагулянага тлушчу вепрукі, стрыножаныя, мэкалі з непрывычкі крутарогія бараны, у лазовых кашах, што схаваліся ў цяньку пад тымі вазамі, сакаталі куры ды га-

гаталі гусі. Гаспадары і гаспадыні, перабіваючы адзін аднаго, расхвальвалі кожны свой тавар:

— Свінчо неблагое! За паўцэнак аддам!

— А баранчык! Гля — во які вымахаў!

— Бяры гуску ды на закуску!..

Вазы гаманілі, хваляваліся.

А грузавікі, адкінуўшы заднія барты, паводзілі сябе больш спакойна. Не расхвальвалі тавар, ведалі, што і без тых алёканняў і пахвальбы знойдзецца пакупнік. Прадаўцы кідалі на вагі дарункі калгасных палёў, садоў і ферм — бульбу і гародніну, садавіну і падсвінкаў,— і яны, хочаш ці не, спакушалі нават самага прыдзірлівага гараджаніна...

Крыху правей ад гэтых машын і вазоў, зачапіўшыся вяроўкамі за штыкеціны плота, спакойна пераміналі духмяны поплаў цялушкі-пярэзімкі, белыя, нібы вылепленыя са снегу, козы. Уся гэтая жыўнасць не на зарэз, а для разводу. І той, хто хацеў завесці сабе гаспадарку, абавязкова падыходзіў, спачатку акідваў вокам гаспадара, затым яго скаціну, а потым пытаўся:

— Якая цана?

— Базавая,— таксама коратка адказваў гаспадар і лез па капшук.

Закурвалі, маўчалі, пускаючы адзін аднаму дым, потым, нібы спахапіўшыся, ударалі па руках, у кішэню лез ужо другі — па грошы,— і разыходзіліся.

А ў гэты час на шырозных лавах-сталах ажно

ўгіналіся дошкі ад кашоў брусніцы, сушаных грыбоў, абадранай і абсмаленай да сонечнай жаўцізны птушкі, залацістых брускоў дамашняга масла і шчодрых квадратаў ружаватага, з праслойкай, вясковага сала. Гэты спакуслівы асартымент замыкалі цабэркі і вёдры з мочанай калінай і яблыкамі, салёнымі гуркамі і груздамі.

За тымі сталамі ішлі ўжо дашчаныя паднавесы са свежанінай — баранінай, ялавічынай, свінінай. У белых халатах завіхаліся рубшчыкі, стаялі, упэўненыя ў сабе, маладзіцы, гатовыя кінуць на вагі самы люблівы кавалак...

Базар гаманіў. Адны заходзілі ў гасцінна расчыненыя вароты, другія — выходзілі з іх, несучы сумкі, напакаваныя розным вясковым дабром... І ўсюды — гамонка, няспынная, гарачая.

З непрывычкі ад тае гамонкі рабілася не па сабе, і мы праз якую гадзіну падаліся назад, за вароты.

Юлька ўвесь час, калі хадзілі між базарных радоў, маўчала, а тут не вытрымала:

— Ну і дабра ў людзей! Зроду столькі не бачыла!..

РАБІНАВЫЯ КАСТРЫ

Мясціна тая кожную вясну буяе сакавітай зелянінай. Яна бярэ свой разгон амаль ад вады і далінае ледзь не да разгалістай каржакаватай сасны, што адзінока стаіць на самай вяршыні лясістага пагорка. Сярод таго зялёнага мора ляшчыны відны крыху святлейшыя купінкі. Гэта — рабіна. Нібы хто знарок яе пасадзіў — то там, то тут яна ўзвышаецца стаўбункамі і, калі зацвітае, так і падбівае Юльку схадзіць туды...

Рабіна сыходзіць такім мядовым пахам, што кружыцца галава. А потым той водар гіне...

Юлька зноў пачынае паглядаць на той бераг, калі маці справіць дакопкі. Рабіны тады глядзяцца больш акрэслена, кідка чырванеючы пад восеньскім сонцам. І ўжо зусім яны ўспыхваюць агнём, калі ўдарыць першы марозік, а ляшчыннік скіне лістоту. Тады Юлька бярэ кашы, пераплывае на пласкадонцы возера, ідзе ў лес і набівае іх — па самыя дужкі — сакавітымі гронкамі.

Потым паціху плыве дадому. А прысядзе на сваім беразе адпачыць — і не вытрымае, азірнецца, акіне вокам узлессе і, уражаная ўбачаным, задуменна прамовіць:

— Кастры нібыта...

АПОШНІ ЯБЛЫК

На яблыні толькі дзе-нідзе трапеча пачарнелы лісток ды на самай верхавінцы сядзіць залётным снегірам адзінокі яблык. Усе — і бацька, і маці, і Юлька — глядзяць на тое дзіва з нейкай адкрытай павагай, нібы ганарацца яго такой незвычайнай вытрымкай. Бацька ўжо каторую раніцу падыходзіць да яблыні і цікавіцца: а ці не надакучыла вісець таму снегіру?..

Увесь выгляд яблыка гаворыць, што не. Ад расы і начной прахалоды раздабрэў, разрумяніўся яшчэ болей. Вось-вось стрэліць сокам і расколецца напалам. Але нават каб і дакрануўся рукою, ён усяго што зрабіў бы — смачна рыпнуў...

— Ну, то павісі яшчэ, павісі! — гаворыць бацька і адыходзіць ад яблыні.

Так паўтараецца мо з тыдзень. І хоць з каморкі праз няшчыльныя дзверы дразняць пахам крамяныя антоны, Юлька не бяжыць туды ласавацца. Аскоміна даўно! Яе вабіць той, адзінокі, яблык, і яна чакае — не дачакаецца, калі бацька нарэшце спора яго. Маці не-не ды і скажа:

— Пакінь мучыць дзеўчыну! Ды і мароз прыхапіць можа...

— Не прыхопіць! — супакойвае бацька і дадае: — У нядзелю спорам!..

У нядзелю яны падымаюцца раней звычайнага. Пакуль бацька шукае за хлеўчуком тычку, Юлька стаіць пад яблыняй і ў чаканні незвычайнага трымае напагатове прыпол фартушка. Нарэшце танчэйшы канец тычкі асцярожна дакранаецца да галінкі і паволі паўзе да таго месца, дзе вісіць запаветны яблык. Штуршок — і тое дзіва каменем ляціць уніз і якраз трапляе ў Юльчын фартушок.

Колькі смеху! Колькі радасці!..

А маці гукае з парога:

— То бяжыце ў хату! Прастудзіцеся!

Нібы і не чуюць. І ў хату не бягуць, а ідуць павольна і горда. Потым Юлька ўслед за бацькам сядае за стол і кажа:

— А ты чаму не сядаеш, мама?

Калі маці таксама прымошчваецца на ўслоне, бацька дастае з шуфлядкі ножык-складанчык, і, пакуль яблык разразаецца на тры часткі, Юльчыны вочы гараць шчасцем...

ПОДЫХ ВОСЕНІ

У той дзень падкралася чамусьці да сэрца няпрошаная туга. Хадзіў па казачным асеннім Астравецкім лесе, а думалася: хто ведае, колькі каму адмерана ў жыцці... Можа, і твая восень не за гарамі. Возьме ды выйдзе раптам на дарогу, таропка абаўе тваю шыю рукамі, а вочы абсыпле халоднымі пацалункамі... Хто ведае... Можа, і дзяцел не адстукае табе ніводнага лішняга дня... А як хацелася б!..

...Бо шмат чаго яшчэ не зроблена на зямлі.

СВЕЖАНІНА

На самым пачатку зімы, калі пад раніцу заўсёды шорхне ля студні пралітая звечара вада, пачынаецца для Юлькі самае цікавае. Нупрэй у такія дні ў Астраўку нарасхват. Звычайна з ім дамаўляюцца загадзя, і тады на світанні то ў Арсенавым хлеўчуку, то ў Аборавым, то ў іхнім ускрыквае спрасоння вяпрук, а потым з двара казытліва пацягне на вёску паленай саломай.

Толькі падасць той голас вяпрук, пачнуць рыпаць веснічкі. Суседзі сыходзяцца на асветленае агнём дворышча павольна, нават нібы неахвотна. Ніхто быццам не жадае выдаваць сваёй цікаўнасці. А між іншым, у кожнага адна і тая ж думка: а ці не пераплюнулі мяне? А ці маё свінчо не будзе горшае?

Стаяць, перамінаюцца з нагі на нагу, смокчуць цыгаркі і толькі тады-сяды кідаюць якое слоўца. Не, не ў адрас вепрука, а так — абы нешта сказаць, абы не маўчаць.

Даўней, нават Юлька памятае, кожны з іх ганяўся за салам. Чым таўсцейшае напасвіць гаспадыня на сваім вепры, тым большы гонар ёй. А цяпер — наадварот. Цяпер падавай усё ў праслоечку — і сала, і мяса...

Нарэшце Нупрэй бярэ жменю саломы, выці-

рае вепрука і пачынае абмацваць. Спачатку кумпякі, потым лапаткі, а затым ужо і падчарэўе. Ляпнуўшы ў дадатак да ўсяго па свіным азадку, весела кажа:

— Хоць сала і на чатыры пальцы, але беконістае!..

Пачуўшы такое, суседзі пачынаюць разыходзіцца. Таксама павольна, таксама нібы неахвотна.

Калі вяпрук, вымыты да жаўцізны, ляжа на шырокую лаву, прыбягаюць жанкі. Іх не цікавіць, якое сала — беконістае ці не,— яны ўжо ведаюць пра гэта. Іх турбуе іншае:

— Мо каляндры няма?

— А часнык патрэбен?

— Я ўспомніла, што ў мяне перац ёсць!..

Праз нейкі час разыходзяцца і яны. Пад рукамі ў Нупрэя круцяцца толькі свае, адносячы ў каморку свежаніну. Ад свежаніны ідзе такі пах, што нават, прысеўшы воддаль, нецярпліва аблізваецца Мікіта. Нупрэй заўважае гэта, выразае кавалак і кідае пад плот:

— На і табе... люблівага!..

Маці ўжо не відаць. Яна недзе смажыць на газавай плітцы пячонку. Бацька адзін адносіць апошнія польцы сала і тады толькі кажа Нупрэю:

— То канчайце! Бульба на стале стыне!

Стол, сапраўды, прыбраны, нібы на свята. Пасярод, у ёмістай місе, хаваецца пад воблачкам

пары сопкая бульба. Правей ад яе, на трыножцы,— глыбокая патэльня са смажанінай: пячонкай, люблівым салам і паляндвіцай. Пра капусту маці таксама не забылася. Яна, затопленая ружовым тлушчам, займае пачэснае месца злева, каля стоса хлеба. І, нібы між іншым, сярод гэтага багацця сарамліва пацее пляшка...

За стол садзяцца ўчацвярых. Першы падымае чарку бацька і кажа:

— За тваё здароўе, Нупрэй!

— І за тваё! — адказвае стары і прыгубляе чарку.

Праз нейкі час маці гаворыць:

— Вы, мужчынкі, частуйцеся, а мы [redacted] Юлькай пабяжым, разнясём лішкі суседзям...

Юлька бярэ кошык, у якім ужо даўно, загорнутыя ў паперу, ляжаць «лішкі» — кавалкі самага люблівага мяса, рабрынак ды сала ў палосачку,— і ўслед за маці выходзіць з хаты.

ДВОЕ

Яны стаялі, абняўшыся, паблізу дарогі на Астравок. Быццам закаханыя пасля доўгага расстання. Калі зразумелі, што аднаму без другога не жыць...

З кожным крокам у маім сэрцы нараджалася ўсё большая павага да іх. І раптам...

— Божа! Вы зусім старэнькія! — вырвалася ў мяне.— І колькі вятроў прашумела над вашымі галовамі! Але выстаялі вы. Праўда?

Дрэвы маўчалі.

ЛЮБОЎ І НЯНАВІСЦЬ

Лёгкім снегам прыцярушаная лясная сцежка. Паабапал, спрацаваныя за лета, у ціхай стоме стаяць каржакаватыя дубы. Надыходзіць зіма, а яны — спакойныя, упэўненыя ў сваёй сіле і непахіснасці. Стаяць сцяною, і ніякі вятрыска ім не страшны.

Так і людзі нашы. У дні нягоды таксама сталі сцяною перад ворагам. Як асілкі. Як волаты. І выстаялі!..

Бо ў сэрцах нашых акрамя любові да зямлі роднай ёсць і нянавісць. Да ўсяго благога.

СНЕГАВІЧОК

Насупраць Юльчынай хаты стаіць клён. Той клён аблюбавалі вераб'і і кожны дзень збіраюцца там на свой злёт. Толькі прыйдзе Юлька са школы, сядзе рыхтаваць урокі, а вераб'і тут як тут — зляцеліся! Спачатку нібы знаёмяцца: «Чый, чый?» А калі пазнаёмяцца — пачынаюць гамонку.

Іншы раз птушкі ўзнімуць такі гармідар, што Юлька не вытрымлівае, выходзіць з хаты і гукае:

— Кыш! І чаго вы не падзялілі там?!

Вераб'і палохаюцца, уздымаюцца з дрэва і лясяць на выган. Але варта Юльцы зачыніць за сабою дзверы, як неслухі вяртаюцца і яшчэ званчэй бяруцца абмяркоўваць свае вераб'іныя справы.

Надакучыла Юльцы сварыцца з вераб'ямі, і яна вырашыла правучыць іх. «Пастаўлю сіло,— сказала яна сабе.— Спаймаю самага хуліганістага і дам яму пстрычак...»

Але не так проста цяперашняга вераб'я правесці на мякіне. Сіло стаяла на сметніку, птушкі ў той бок нават не глядзелі. А як выпала пароша, Юлька не пашкадавала сыпануць прасяных круп. І спакусіла-такі вераб'ёў. Чародка шуганула з клёна і пачала частавацца.

Юлька счакала хвіліну-другую ў засадзе, а ка-

лі пабегла на сметнік — ад здзіўлення ажно застыла. У сіле не было ніводнага вераб'я, а толькі трапятаў нейкі белы камячок.

— Дзіва! — сказала Юлька.— Колькі жыву, а такога не бачыла...

Трымала бялюткую, як жменька свежага снегу, птушачку і, забыўшыся пра тую пстрычку, дапытвалася:

— І адкуль ты ўзялася такая? Нібыта і верабей і — не верабей... Чысты снегавічок!..

Птушка зірнула чырвоным вокам і ціўкнула. Нібы прасіла прабачэння. І Юлька расслабіла далонь.

Белы камячок чырыкнуў ад радасці, паляцеў на клён і згубіўся ў вераб'інай грамадзе.

З таго дня Юлька не злуе на вераб'ёў. Наадварот, радуецца, калі тыя збіраюцца ля хаты на чарговы свой злёт. І калі яна вяртаецца са школы, перш чым сесці за хатняе заданне, абавязкова пытаецца ў маці:

— А ці не бачыла ты сёння нашага Снегавічка?

— А няўжо! На верхняй галінцы скача! — адказвае маці і ў сваю чаргу, з усмешкай на твары, цікавіцца: — А ці ведаеш, пра што вераб'і гамоняць з ім?

Юлька спачатку паціскае плячыма, а потым хітравата ўсміхаецца:

— Дапытваюцца, мабыць, адкуль ён такі прыгожанькі ўзяўся...

ПАСЛЯ ПАРОШЫ

Яшчэ звечара неба насупілася, пацяжэла і, нібы свінцовае, павісла над зямлёю. Пад раніцу нечакана выпаў снег і ўсё памаладзела: і лес, што зялёнай сцяною падступаў да самага сяла, і хаты, і прысады ля іх.

Кожны па-свойму радаваўся першай парошы. Юлька — таму, што можна будзе дастаць з гары-шча лыжы, дзед Нупрэй — што не стане болей да-кучаць раматус, Арсен — што пачынаецца самая цікавая пара: адстрэл дзікоў па дазволу. Радаваў-ся і Абора — мясцовыя паляўнічыя нарэшце пры-нялі яго ў сваю кагорту...

Яшчэ сніла свае незвычайныя сны Юлька, яшчэ варочаўся на печы стары Нупрэй, а гэтыя вечныя непаседы — паляўнічыя — былі ўжо на нагах. Паперадзе ішоў Арсен і раіў:

— Галоўнае, хлопцы, не мазаць. Бо з дзіком жарты благія...

Вось і тое ўрочышча, дзе яшчэ загадзя выса-чылі некалькі дзікоў. Расставілі нумары і пачалі чакаць. Абору выпала не вельмі віднае месца, так сабе — някідкая лагчынка з рэдкімі капічкамі лазняку. Ён і рады быў такому і не рады. Але па-радак ёсць парадак. І Абора прысланіўся да са-сонкі і ўзвёў куркі.

Мо з гадзіну нудзіўся на той лагчынцы. Нарэшце недзе там, у глыбі лесу, сабакі падалі голас, а потым усё наваколле напоўнілася залівістым брэхам. «Прудзяць ужо!» — здагадаўся Абора і ажно наструніўся.

Сабакі чутны лепш і лепш. Потым грымнуў стрэл. Гэта было так нечакана, што Абора не разабраўся — справа грымнула ці злева. А зрабіў крок ад сасонкі, каб лепш агледзець лагчыну, як заўважыў: чэша нехта напрасткі праз кустоўе ў яго бок — ажно снег курыць! Нават стрэльбы не ўскінуў, як тое, вялізнае і чорнае, маланкаю кінулася пад ногі і...

Ачомаўся ў лазняку, за дарогай, без шапкі і стрэльбы. Азірнуўся і ад таго, што ўбачыў, ледзь не самлеў: у некалькіх кроках ад яго ляжаў зрынуты дзік.

На месца здарэння пазбягаліся паляўнічыя. І застылі ў здзіўленні: Абора, расхрыстаны, але з пераможным выглядам, сядзеў на тушы дзіка і еў сала з батонам...

Калі дзед Нупрэй запытаецца іншы раз у Аборы наконт яго паляўнічых спраў, той, не міргнуўшы вокам, адказвае:

— А б'ём патроху! І дзікоў, і зайцоў...

І хітравата жмурыцца. Нібы прыцэльваецца...

ЧЫРВОНЫЯ РУКАВІЧКІ

Юлька толькі што вярнулася са школы, адагрэла ля грубкі азяблыя рукі, перакусіла збольшага і села за падручнікі. Задача выдалася непадатлівай, але Юлька ўсё ж адолела яе. Хацела ўжо было брацца за чытанку, як у сенцах пачаў прасіцца кот. Юлька паднялася, прачыніла дзверы і, калі разам з белымі клубамі пары цераз парог кульнуўся Мікіта, незлабліва, як звычайна ў такіх выпадках маці, сказала:

— Ух, валацужнік!..

Калі па-шчырасці,— Юлька яго недалюбліва-ла. За ляноту. Вось і сёння Мікіта швэндаўся недзе па возеры, палонкі правяраў, а каб мышэй папільнаваць у каморы — дык не! Хацела спачатку паўшчуваць ката за гэта, ды раздумала — усё роўна не зразумее. А Мікіта толькі бліснуў зялёнымі вачыма, сігануў на прыпечак, разлёгся ў цяпле і, рады такой выгодзе, пачаў драмаць.

Юлька незадаволена паглядзела на яго, зноў абазвала валацужнікам і падумала пра Альму: а яна недзе ляжыць пад паветкаю, на марозе, і не просіцца ў хату... Юльцы зрабілася шкада яе, адклала чытанку, дастала з-за коміна валёнкі, уступілася ў іх, накінула на плечы старэнькі матчын кажушок і выбегла на мароз.

...Альма першая пераступіла парог і асцярожна пайшла да грубкі — нібы баялася наслядзіць. Але сляды ўсё ж засталіся ляжаць на падлозе цёмнымі плямамі. Юлька распранулася, закінула за комін валёнкі, узяла анучку, выцерла і свае сляды, і Альміны, зноў умасцілася на табурэтку і сказала:

— Пагрэйся, Альмачка, а я крыху пачытаю...

Толькі чамусьці не чыталася. Думалася ўсё пра Альму. Пра завіруху-завею, што пачынае завываць за акном. Пра тое, як тая завея штоноч не дае спакою Альме. Мо з гэтай прычыны Альма і злуецца на Мікіту. Вось і цяпер яна, лежачы ля грубкі, толькі робіць выгляд, што не звяртае на ката ўвагі. А паспрабуй саскоч ён з прыпечка!..

Юльцы хочацца, каб доўга яшчэ не прыходзіла з працы маці, каб Альма паляжала ў цяпле — адагрэлася. Бо калі маці прыйдзе, то абавязкова возьмецца за венік... І давядзецца тады Альме да раніцы гібець пад паветкай...

Можна было б ужо запаліць і святло, але ў прыцемках сядзець гэтак добра! Юлька глядзіць на пасінелую шыбіну і на хвіліну забываецца і пра Мікіту, і пра Альму, і пра тое, што перад ёю ляжыць чытанка... А там, за акном, гуляе завейка. Яна то пакруціцца ля плота, то прыпадзе да шыбіны — нібы таксама просіцца ў хату... А потым Юлька нечакана заўважае: нехта пачынае на шкле маляваць кветкі. Яны вырастаюць адна за



другой, прыгожыя, нібы з казкі. Рупіць Юльцы дакрануцца да гэтага дзіва рукою, але не асмельваецца.

Нечакана ў сенцах пачуўся тупат. Юлька здагадалася: гэта маці абівае з валёнак снег. Хацела было падхапіцца, уключыць святло, але адчыніліся дзверы, у хату ўвайшла маці і апярэдзіла Юльку — пстрыкнула ўключальнікам. У яркім святле Юлька ўбачыла памаладзелую — ад марозу — маці і чамусьці ўзрадавалася такому. А тая ішла ўжо да стала і весела гаварыла:

— Зачакалася, дачушка?.. А я па дарозе заскочыла ў магазін. Рукавічкі табе новыя купіла... Чырвоненькія...

І яна паклала перад Юлькай пакуначак.

Юлька разгарнула паперу, дастала абнову і надзела спачатку адну рукавічку, потым другую. Рукавічкі сядзелі як улітыя, і Юлька ўсміхнулася такой выгодзе. Нават Альма не вытрымала, падышла, панюхала чырвоную рукавічку і, задаволеная, замахала хвастом.

ПАЛОННІКІ

Нешта з тыдзень гуляла завіруха. Калі наўкол, дзе толькі магла, намяла гурбы снегу, нечакана апамяталася і нібы спахапілася: а што гэта я нарабіла тут?

Юлька таксама здзіўлялася паводзінам зімы і, як усё ўгаманілася, пачала прыводзіць у парадак падворак — расчышчала сцежкі да хлява, дабраба і калодзежа. У той нядзельны дзень да абеду не пераставала махаць шуфлем, а потым, калі падворак набыў належны выгляд, уздумала пабегчы ў лес — паглядзець, што там сталася.

Лес быў насцярожаны. У яго прыціхлым пошуме згадваліся і здзіўленне да ўсяго таго, што нядаўна было, і нібы недавер да сённяшняга. Нясмела распраўлялі плечы яліны. Ківалі галовамі высозныя сосны. І толькі дубы стаялі спакойна, з усведамленнем свае моцы.

Ногі час ад часу правальваліся ў глыбокі снег, але Юлька выбірала не так занесеныя мясціны і крочыла далей. Яна ўжо не спадзявалася ўбачыць ні якога звярка, ні якую птушку. Столькі прайшла, а ніхто ні голасу не падаў, ні следу не пакінуў!.. Усё нібы пагінула, нібы вымерла за тыя завейныя дні. «Ну і няхай! — вырашыла Юлька.— Праз дзень-два ачомаюцца!»

Вярталася дадому берагам рачулкі, што брала свой пачатак з лясной крыніцы. Рачулку нават і цяпер не прыхапілі маразы — нястомна бруіла і бруіла між белых берагоў. І толькі непадалёку таго месца, дзе ўпадала ў возера, бег яе амаль спыняўся, а над паверхняю вады стаяла пара.

Раптам адтуль, нарабіўшы плёскату і лопату, узнялася белая чарада вялізных птушак, зрабіла круг і села на процілеглым беразе.

Юлька ў здзіўленні спынілася. Лебедзі? Адкуль яны? І зімою? Тое, што ўлетку на возеры, за Выспай, жыла сям'я гэтых птушак, яна ведала, але сустрэць іх тут, амаль побач з вёскай, сярод снягоў, не чакала.

Абышла тое месца, адкуль падняліся птушкі, агледзела бераг і неглыбокае рачное дно. На кромцы лёду былі даўнія птушыныя сляды, а дно старанна вычышчана ад расліннасці. «Голад не цётка!» — сама сабе сказала Юлька і пайшла ў вёску. Пад вечар яна зноў з'явілася тут і высыпала ў рачулку торбачку варанай бульбы.

З таго дня для Юлькі пачаліся новыя турботы. Перад тым як ісці ў школу, яна набірала ў торбачку яшчэ звечара адвараную бульбу і знаёмай сцежкай кіравала туды, дзе, ведала, чакала яе ажно пятнаццаць белых палоннікаў. Птушкі ўжо не палохаліся, а толькі на ўсялякі выпадак адплывалі ад берага і пазіралі, калі Юлька нарэшце высыпле тую бульбу...

Перад Новым годам нечакана зноў ударылі

маразы, і ў Юлькі прыбавілася турбот. Каля сотні крыжанак таксама знайшло на рэчцы прытулак. Юлька паглядала, як сярод той шэрай чарады на правах гаспадароў плавалі лебедзі, і радавалася: нічога, жывіце! Хопіць усім і месца, і корму!

Так прайшлі снежань, студзень, люты. А калі ў сакавіку падзьмулі з поўдня цяплейшыя вятры і на возеры пачаў чарнець лёд, першыя пакінулі сваё прыстанішча няўрымслівыя крыжанкі. Павесялелі і лебедзі — сустракалі Юльку бадзёрымі ўскрыкамі, але развітвацца з прыветнай мясцінай яшчэ не адважваліся.

Нарэшце і з імі надышоў час ростані. У тую раніцу надзвычай ярка свяціла сонца. Лебедзі з горда ўзнятымі галовамі плавалі ў рацэ і аб нечым ажыўлена гаманілі. Яны счакалі, пакуль Юлька высыпле з торбачкі сняданак, падплылі да таго месца і пачалі сілкавацца. Потым раптоўна, нібы згаварыўшыся, падняліся на крыло. Зрабілі адзін круг, другі, набіраючы вышыню, і ўзялі кірунак на сінія лясы.

А Юлька яшчэ доўга стаяла на беразе і ўсё глядзела ўслед птушкам...

ДАРОГІ

Як існавалі б людзі, каб не было дарог?

А нехта ж першы пачаў церабіць іх праз горы, лясы, балоты... Другім ісці было лягчэй. І яны дзякавалі таму, першаму. А потым забываліся пра яго і, паміраючы, аддавалі сваім нашчадкам безымяннымі тыя дарогі.

Калі іду па дарогах маёй зямлі, так і рупіць даведацца, хто быў першапраходцам. І хочацца на сівых камянях высекчы яго добрае імя.

ВЕСНАХОД

Здаецца, яшчэ ўчора панавала над зямлёю здранцвенне, а сёння — абудзілася ўсё чыста. І як тут уседзіш у хаце!

Мы прымасціліся на прызбе і слухаем тое вялікае абуджэнне. Над самай хатай, у небе, ажно заходзяцца ад радасці кнігаўкі:

— Жы-ыць!

— Жы-ыць!..

— Раскуляліся! — задумліва адзначае Юлька.

Падабрэлая ад сонечнай шчодрасці, яна здымае з галавы хусцінку і ўжо весела гаворыць:

— А я чамусьці веснаход страчаю заўсёды, як дзіва якое...

Мне відно, як Юльчыны вочы наліваюцца сінім-сінім небам, і на душы робіцца радасна. Радасна, што яна — побач, што ў небе куляюцца і кігікаюць кнігаўкі, што па зямлі шыбуе веснаход...

РАЗВІТАННЕ

— Вось і ўсё! — сказаў я нарэшце Юльцы.— Набыўся ў вас. Назад ехаць трэба!..

Юлька насупілася, спахмурнела. І ўвесь час ні на крок не адыходзіла ад мяне. Здавалася, яна жыла адзіным клопатам — як найлепш дагадзіць мне сабрацца. Склалі мы ў чамаданчык мае пажыткі, я падзякаваў Юльчыным бацькам за прытулак, развітаўся і ступіў за парог. Юлька таксама выйшла з хаты і ціха сказала:

— Я да пачакалаўкі правяду...

Ішлі моўчкі. На сэрцы было ніякавата. Не паспеў здружыцца з Юлькай, з людзьмі, што жывуць побач з ёю, а трэба развітвацца... І міжволі пазайздросціў і Юльцы, і яе бацькам, і Арсену, і Нупрэю, якія застануцца тут — са сваімі клопатамі, марамі, спадзяваннямі. А ці давядзецца калінебудзь зноў пабачыцца з імі?.. Можа, і мяне, як таго барадача-мастака, незразумелая сіла зноў пацягне сюды? Толькі ці змагу людзям гэтым адплаціць за іх дабрыню?.. Ці буду вечным даўжніком іхнім?..

Не заўважыў нават, як падышлі да аўтобуснага прыпынку. Там ужо тапталася некалькі чалавек. Мы прыселі на лавачку.

Нарэшце з-за павароткі вынырнуў аўтобус.

Юлька падхапілася і падала мне сваю цёплую далоньку.

— То бывай! — сказала і адвярнулася.

Пакуль я ўмошчваўся на сядзенні, пакуль сціраў з шыбіны пыл — увесь гэты час Юлька стаяла ля «пачакалаўкі» і нібы з дакорам паглядала на мяне.

Аўтобус нарэшце крануўся і, рыпнуўшы рысорамі, паволі пакаціў па торнай дарозе. Прабег крыху, павярнуў на гасцінец і толькі тады ўзяў разгон.

Я зірнуў у акно і здзівіўся: там, на пагорку, ля вёскі, усё яшчэ чырванела Юльчына плацейка...

ЗМЕСТ

У дарозе 3
Астравок 6
Русалка 7
Гарачым поўднем 9
Вечарам 12
Ласіха 17
Таямнічыя люстэркі 19
Лесавічкі 21
Пеця-певень 23
Чалавек вады 27
Абнаўленне 29
Мы ідзём на Сіцылію 30
А што за сінімі лясамі? 34
Песня старых плытагонаў 39
Нечаканая сустрэча 42
Пчаліны пастух 45
Памяць 48
Глушэц 49
Ліпа цвіце... 51
Дрэвы і людзі 53
Жукава поле 55
Лясная казка 58
На Выспе 59
Буся 64
У дзіцячым лесе 68
Ракі 70
Танец грыбоў 72
Бессмяротны дзед 74
Смутак 78
Мара 80
Чмялі 81

Цыганскі барон 84
Чабаровы бераг 86
Альма 88
Змяя на вудзе 91
Зязюльчына дачка 93
Вусаты Нэсі 95
Ліхтарыкі 97
Як помсцілі пчолы 99
Агонь 101
Да Фількі ў госці 102
Чылім 105
Гармонія 107
Экспедыцыя на Зубровую паляну 108
Выпадак на беразе 112
Дамок-церамок 113
Пампушка 115
Лясныя манахі 118
Асілкі 120
Жывая вада 121
Верасвёўскай ноччу 123
Звычай 124
Дзень бабінага лета 125
Час капусты 127
Базарным днём 131
Рабінавыя кастры 134
Апошні яблык 135
Подых восені 137
Свежаніна 138
Двое 141
Любоў і нянавісць 142
Снегавічок 143
Пасля пароши 145
Чырвоныя рукавічкі 147
Палоннікі 151
Дарогі 154
Веснаход 155
Развітанне 156

Пархута Я.

П 18 Там, дзе жыве Юлька. Лірычныя навелы. Мн., «Маст. літ.», 1978.

160 с.

«Там, дзе жыве Юлька» — новая празаічная кніжка пісьменніка Яраслава Пархуты. Лірычныя навелы запрашаюць чытача ў таямнічы свет прыроды, знаёмяць з цікавымі людзьмі, якіх аб'ядноўвае адна рыса: яны з дзяцінства апчадна адносяцца да роднай зямлі.

Разам з аўтарам чытач пабудзе на рэках і азёрах, у запаветных кутках Палесся, сустрэне на золку новы дзень, паслухае песні птушак, гоман меднаствольных бароў. У свет цудоўнага і дзівоснага павядзе яго і галоўны герой кніжкі — Юлька.

Бел 2

П $\frac{70803-061}{М\ 302(05)-78}$ 154—78

ЯРОСЛАВ СИЛЬВЕСТРОВИЧ ПАРХУТО

Там, где живет Юлька

Лирические новеллы

Для детей среднего школьного возраста

На белорусском языке

Рэдактар В. Д. Рудава. Мастак Л. М. Лобан. Мастацкі рэдактар М. Р. Казлоў. Тэхнічны рэдактар З. Г. Сень. Карэктар А. Т. Глушчанка.

ІБ № 47

Здадзена ў набор 07.06.77. Падп. да друку 07.03.78. АТ 09620. Фармат $70\times100^1/_{32}$. Папера друк. № 1. Гарнітура шк. Друк. выс. Ум. друк. арк. 6,45. Ул.-выд. арк. 4,61. Тыраж 14 000 экз. Зак. 378. Цана 15 кап.

Выдавецтва «Мастацкая літаратура» Дзяржаўнага камітэта Савета Міністраў БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. 220004, Мінск, Паркавая магістраль, 11.

Паліграфічны камбінат імя Я. Коласа Дзяржаўнага камітэта Савета Міністраў БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. 220005, Мінск, Чырвоная, 23.


15 к.